ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 36-ы
№ 12 (2269)
9 лютага 1968 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

БЕЛАРУСКІ КІНАДАКУМЕНТ СЁННЯ І ЗАЎТРА

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА КІНЕМАТАГРАФІСТАЎ БССР

«Сённяшні стан і далейшае развіццё беларускай дакументальнай і навукова-папулярнай кінематаграфіі» — гэтаму пытанню быў прысвечаны пленум праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР, які 7 і 8 лютага працаваў у Мінску.

У 1966 і 1967 гадах беларускія дакументалісты выпусцілі 49 фільмаў. Многія з іх былі паказаны ўдзельнікам пленума перад пачаткам дыскусіі.

Даклад на пленуме зрабіў член прэзідыума праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР А. Красінскі. У спрэчках выступілі: Е. Бондарава, У. Стральцоў, В. Нячай, П. Васілеўскі, А. Вялюгін, І. Вейняровіч, А. Забалоцкі, В. Гарохаў, С. Міхайлава, Р. Кармен, А. Астроўская і старшыня Дзяржаўнага камітэта па кінематаграфіі Савета Міністраў БССР Б. Паўлёнак.

У рабоце пленума прыняў удзел намеснік загадчыка аддзела культуры ЦК КПБ Я. Парватаў. Гасцямі беларускіх кінематаграфістаў былі сакратар прэзідыума праўлення Саюза кінематаграфістаў СССР, лаўрэат Ленінскай прэміі Р. Кармен і кінасцэнарыст В. Гарохаў (Масква).

□

Падрабязная справаздача аб рабоце пленума будзе змешчана ў наступным нумары нашай газеты.

Група ўдзельнікаў пленума—(злева направа) пісьменнік Анатоль Вялюгін, рэжысёр-аператар І. Вейняровіч, лаўрэат Ленінскай прэміі рэжысёр Р. Кармен, рэжысёр С. Сплашноў, аператар Р. Масальскі.
Фота Ул. МЯЖЭВІЧА.

ЗА КРУГЛЫМ СТАЛОМ «МАЛАДОСЦІ»

У студзеньскай кніжцы часопіса «Маладосць» быў апублікаваны артыкул Алеся Яскевіча «Там, за дальнім гарызонтам» — пра пакаленне пісьменнікаў, якое прыйшло ў літаратуру ў канцы пяцідзесятых гадоў.

У аўторак, 6 лютага, у клубе Саюза пісьменнікаў быў праведзены круглы стол «Маладосці». За ім ішла гаворка па тых пытаннях, якія закраналіся А. Яскевічам, і шырэй — пра сучасную беларускую літаратуру ўвогуле. У прыватнасці, абмяркоўваліся праблемы традыцый і наватарства, фальклору і літаратуры, узаемаадносін крытыка і пісьменніка, крытыка і чытача, літаратурнай вучобы і г. д.

У гаворцы прынялі ўдзел Л. Арабей, А. Асіпенка, Я. Брыль, А. Вярцінскі, В. Вітка, В. Каваленка, В. Палтаран, Н. Пашкевіч, Б. Сачанка, А. Сідарэвіч, М. Стральцоў, І. Чыгрынаў, А. Яскевіч.

З ГАСТРОЛЯМІ ПА КРАІНЕ

Канцэртамі ў Казані пачынае вялікае гастрольнае турнэ Дзяржаўны ансамбль танца БССР. Беларускія танцоры выступяць ва Ульянаўску, Куйбышаве, Волгаградзе.

Другі беларускі калектыў— Дзяржаўны народны аркестр БССР выехаў на канцэрты ў Свярдлоўск, Омск, Новасібірск. З першым канцэртам беларускія музыканты выступяць у Палацы культуры Уралмашзавода. У канцэртах прыме ўдзел народны артыст БССР Зіновій Бабій.

З вялікай сольнай праграмай адпраўляецца ў паездку на Далёкі Усход заслужаны артыст БССР Віктар Вуячыч.

У Маскве пачаліся канцэрты дыпламанта Усесаюзнага конкурсу савецкай песні Нэлі Багуслаўскай з інструментальным ансамблем Белдзяржфілармоніі пад кіраўніцтвам дыпламанта Усесаюзнага конкурсу І. Капланава.

У Ленінградзе на працягу месяца адбудуцца выступленні эстраднай групы беларускіх артыстаў пры ўдзеле заслужанага артыста БССР Рыгора Дзідэнкі.

В. ПЯТРОЎ

У АДНОЙ СПРЭЖЦЫ

АБ СІНТЭЗЕ АРХІТЭКТУРЫ І ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

НАРАД ці трэба даводзіць неабходнасць цеснага супрацоўніцтва архітэктараў і мастакоў. А вось шляхі яго варта абмеркаваць і выразна акрэсліць. Манументальна-дэкаратыўнае мастацтва ў нашай рэспубліцы, па сутнасці, толькі нараджаецца. Таму цяпер востра паўстала пытанне — як каардынаваць творчае ўзаемадзеянне дойлідаў і мастакоў, як найбольш дакладна планаваць іх адказную работу?

НОВЫЯ архітэктурныя рашэнні ў апошнія гады несумненна паўплывалі на пошукі нашых майстроў манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. Бярэцца на «ўзбраенне» новая тэхніка, матэрыялы. Мастакі адмаўляюцца ад прасторавых рашэнняў задуманай тэмы. Аднак гэта толькі фармальнае рашэнне пытанняў сінтэзу архітэктуры і мастацтва. У аснове ж глыбока зразуметага сінтэзу — унутраная роднасць мастацтваў. Стала «притчей во языцех» патрабаванне да архітэктара і мастака працаваць плячо ў плячо з самага пачатку праектавання. І, здаецца, воз такі рушыў з месца (праўда, мастакі прымаюць удзел у агульнай справе на апошніх стадыях работы).

Іншы раз, уважліва разглядаючы манументальную кампазіцыю, быццам бы знаходзіш некаторую роднасць паміж вобразамі архітэктурным і манументальным. Але, цвяроза ўзважыўшы ўсе ўзаемаадносіны манументальнага вобраза з архітэктурай і, галоўнае, з чалавекам, заўважаеш, што твор, які, здавалася б, адпавядае патрабаванням сінтэзу архітэктуры і мастацтва, — усяго толькі эрзац.

Так, у мазаіцы кінатэатра «Партызан» у Мінску (архітэктар Ю. Шпіт, мастак М. Данцыг) адчувальная ідэя архітэктара і мастака, тэма і змест мазаікі адпавядаюць нават назве кінатэатра. Аднак пано, непамерна расцягнутае (на ўсю шырыню фае), не ўспрымаецца цалкам ні ўнутры будынка, ні звонку. Парушана важнейшая ўмова манументальнага мастацтва: ёмістасць зместу не адпавядае ёмістасці ўспрыняцця. Калі архітэктар прадугледзеў у праекце месца для манументальнага пано, дык мастак абавязаны быў дакладна вывучыць магчымасці ўздзеяння на гледача такога вялікага пано і адпаведна вырашыць, якімі пластычнымі сродкамі, якім вобразным ладам рашаць задачу. Цяпер жа работа (агромністая!) выканана, і яе не здымеш. А між тым вялікія плоскасці бакавых сцен будынка кінатэатра, асабліва той сцяны, што добра відаць з любога месца вуліцы Талбухіна, якраз і далі б куды больш магчымасцей для вырашэння манументальна-дэкаратыўнага афармлення.

Мне здаецца, больш удала манументальнае мастацтва ўдзельнічае ў экстэр'еры і інтэр'еры Палаца культуры камвольнага камбіната ў Мінску (архітэктар С. Мусінскі, мастакі Г. Вашчанка і Ул. Стальмашонак). Асабліва каштоўна тое, што тут яно ўпершыню ў нас выйшла ў адкрытае асяроддзе. Неабходна і надалей скарыстоўваць для манументальнай прапаганды тыя магчымасці, якія даюць грамадскія будынкі — ідэйна-кампазіцыйныя цэнтры вялікіх архітэктурных масіваў.

Я не буду гаварыць аб вартасцях кампазіцый «Мастацтва» і «Барацьба за мір» на будынку Палаца культуры камвольнага камбіната (пра іх у свой час гаварылася дастаткова). Істотней сказаць пра спробу мастакоў смела і шырока прымяніць прынцып сінтэзу мастацтваў. На маю думку, і архітэктарамі (у першую чаргу), і мастакамі дапушчаны істотныя пралікі. Справа ў тым, што Палац узводзіўся па старому тыпавому праекту. У ходзе будаўніцтва былі зроблены спробы «асучасніць» будынак. У пэўнай меры гэта ўдалося, асабліва пры рашэнні інтэр'ераў. Немалая роля ў гэтым твораў манументальнага мастацтва. Дасягнута пэўнае адзінства пластычных рашэнняў кампазіцый і архітэктуры. Удала выбрана на чыстых плоскасцях фасада тэхніка зграфіта. Але адзінства гэта, хутчэй, знешняе, стылявое. Мастакі, абапіраючыся на сучаснае разуменне задач манументальнага мастацтва, з большым поспехам вырашылі вобразны лад кампазіцый, чым дойліды— вобраз архітэктурны. Унутранай роднасці дасягнуць было цяжка. Манументальныя кампазіцыі, створаныя на сучасным узроўні, былі накладзены на будынак, які вытрыманы ў традыцыях архітэктуры 50-х гадоў. Натуральна, што поўнай злітнасці манументальнага мастацтва і архітэктуры, поўнага адзінства кампазіцыйнай задумы, у аснове якой была б пэўная сістэма арганізацыі прасторы, у дадзеным выпадку дасягнуць было немагчыма. Кантакт архітэктара і мастака аказаўся больш цесным у інтэр'еры — пры вырашэнні танцавальнай залы, дзе эмацыянальнае ўздзеянне архітэктуры ўзмоцнена мазаічным пано (мастак Г. Вашчанка). Дэкаратыўная кампазіцыя разлічана на стварэнне пэўнага настрою. Яна гарманічная. У ёй — чысціня сілуэтаў, пявучыя рытмы, стрыманы каларыт. Усё гэта адпавядае стрыманасці архітэктурнага рашэння залы. Некаторая фрагментарнасць кампазіцыі, праўда, некалькі парушае тэктанічную сувязь пано з архітэктурай. І ўсё ж пакуль што гэта адзін з лепшых прыкладаў супрацоўніцтва архітэктараў і мастакоў у рэспубліцы.

МЫ ІНШЫ раз папракаем архітэктараў за тое, што яны не прадугледжваюць у праектах манументальна-дэкаратыўныя работы, не выдзяляюць для іх месца. Але пры існуючых традыцыях запрашэння мастака ў асноўным пасля сканчэння будаўніцтва архітэктары, натуральна, баяцца што мастак можа ў чымсьці парушыць завершаны архітэктурны вобраз, зразумець яго недастаткова глыбока. Нават вялікі Карбюзье прадузята ставіўся да запрашэння мастакоў і рабіў выключэнне толькі для майстроў, у таленце якіх не сумняваўся.

Вось і ў нас архітэктура унікальных грамадскіх збудаванняў не мае сінтэтычных сувязей з манументальна-дэкаратыўным мастацтвам. Возьмем да прыкладу немалаважны для новага архітэктурнага аблічча сталіцы рэспублікі Палац спорту (архітэктары С. Філімонаў і В. Малышаў). Будынак дастаткова арыгінальны па аб'ёмна-прасторавому вырашэнню. Аднак, які б ні быў выразны і эмацыянальны яго архітэктурны лад, Палац трохі адарваны ад акаляючай прасторы, нават, бадай, не пазбаўлены рыс сухасці і аскетычнасці. А ў той жа час маглі б вялікія вонкавыя плоскасці Палаца быць скарыстаны для манументальных кампазіцый. Не менш цікава было б убачыць на адкрытай пляцоўцы перад фасадам будынка скульптурны манумент, які б гібкай, цякучай пластыкай арганічна падкрэсліў выразныя, лаканічныя архітэктурныя формы.

Мы «ўпрыгожваем» манументальнымі ўстаўкамі магазіны, кафэ, рэстараны, фае кінатэатраў, але пакідаем без увагі месцы, дзе бываюць масы людзей, месцы, якія павінны быць асяродкамі сінтэзу мастацтваў. Я маю на ўвазе не толькі плошчы, але і дзіцячыя ўстановы, школы, інстытуты, заводы з прылягаючымі да іх прасторамі.

Быць або не быць манументу ў тым або іншым месцы, залежыць часцей за ўсё ад адпаведных кіруючых арганізацый. І вось што адбылося ў будынку Гарвыканкома ў Мінску (архітэктары С. Мусінскі і Г. Сысоеў). Гэты будынак, па задуме аўтараў праекта, павінен быў арганічна ўключаць у сябе элементы манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. Але арганізацыі, якія крэдытуюць будаўніцтва, не пайшлі насустрач аўтарам.

Часам недавер архітэктара да мастака тлумачыцца і тым, што плоскасць, выдзеленая для манументальна-дэкаратыўных кампазіцый, займаецца падробкай пад манументальнае мастацтва — неарыгінальнымі схематычнымі фігурамі, атрыбутамі, працы, спорту і да т. п. Часцей за ўсё гэта тлумачыцца нецікавасцю мыслення мастака. У выніку такое «афармленне» дыскрэдытуе ідэю сінтэзу, (напрыклад, «афармленне» аўтавакзалаў у Мінску і Віцебску). Мастацкія саветы пакуль што не сталі перашкодай на шляху падобных трафарэтных вырабаў. У многіх праектных арганізацыях ёсць свае мастакі (праўда, іх мала), якія ў большасці маюць сярэднюю адукацыю. Не валодаючы дастатковым вопытам, яны не дасягаюць у манументальна-дэкаратыўных работах мастацкай выразнасці. Архітэктары ж не могуць памагчы ім, паколькі самі не заўсёды ясна ўяўляюць сабе задачы манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.

Яшчэ горш бывае, калі завершаны архітэктарам будынак трапляе ў рукі заказчыка, густ якога не бездакорны. Заказчык па-свойму «аздабляе» будынак. Так, напрыклад, гады два назад я пабываў у новым будынку ўпраўлення Віцебскага дывановага камбіната. Якраз абмяркоўваўся эскіз для манументальнай кампазіцыі ў адной з залаў клуба. Трымаючы шматок паперы з наштрыхаванымі сілуэтамі танцуючых пар, што падыходзілі хутчэй для набіўкі на хустку, чым на сцяну, аўтар эскіза бадзёра апісваў будучую «кампазіцыю» дырэкцыі камбіната. Адміністратарам «эскіз» быў яўна па душы, і яны хацелі зрабіць заказ. Мастакі камбіната запярэчылі, але ім не адразу ўдалося пераканаць знаўцаў-адміністратараў і адхіліць безгустоўны эскіз.

Добрыя і правільныя ўзаемаадносіны існуюць, на мой погляд, паміж гомельскімі архітэктарамі і мастакамі. У новым жылым масіве па Рэчыцкай ша-

[Працяг на 4-й стар.].

УЗНАГАРОДЫ ЎРУЧАНЫ

Намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР І. Ф. Клімаў уручыў 7 лютага Ганаровыя граматы і Граматы Вярхоўнага Савета Беларускай ССР вялікай групе работнікаў літаратуры і мастацтва рэспублікі, узнагароджаных за поспехі, дасягнутыя ў развіцці беларускай савецкай літаратуры і мастацтва.

Ганаровыя граматы і Граматы ўручаны: пісьменнікам М. Ц. Лынькову, А. Я. Макаёнку, П. С. Пестраку, П. Н. Кавалёву, К. Ц. Кірэенку, А. М. Кулакоўскаму, У. І. Корбану, А. С. Бурдзялёву (Русецкаму), А. С. Вялюгіну, В. Ф. Вольскаму-Зейдэлю, М. А. Машары, галоўнаму рэдактару газеты «Літаратура і мастацтва» — Н. Е. Пашкевічу; кампазітарам: Я. К. Цікоцкаму, Л. М. Абеліёвічу, Г. М. Вагнеру, І. М. Лучанку, Ю. В. Семяняку; мастакам: Н. М. Воранаву, І. А. Давідовічу, А. С. Казлоўскаму, К. М. Касмачову, Р. У. Кудрэвіч, У. І. Стальмашонку; загадчыку кафедры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі М. Д. Браценнікаву, артыстцы Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага І. К. Лакштанавай, кінааператару Мінскай кінастудыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў Р. І. Масальскаму і іншым — усяго 58 чалавекам.

Прымаючы ўзнагароды, узнагароджаныя горача дзякавалі за высокую адзнаку іх скромных заслуг і запэўнілі, што прыкладуць усе свае сілы, вопыт і веды, каб апраўдаць аказанае ім давер'е.

І. Ф. Клімаў цёпла павіншаваў узнагароджаных з атрыманнем урадавых узнагарод і пажадаў ім далейшых творчых поспехаў.

БЕЛТА.

З ЛЕПШЫМІ СПЕКТАКЛЯМІ — У МІНСК

Падведзены вынікі агляду спектакляў тэатраў рэспублікі прысвечаных 50-годдзю Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. З 12 юбілейных спектакляў—7 пастаўлены па п'есах беларускіх драматургаў.

За паспяховую падрыхтоўку да юбілею вялікая група творчых работнікаў тэатраў узнагароджана граматамі Міністэрства культуры БССР і БРК прафсаюза работнікаў культуры.

Спектаклем Гомельскага абласнога драматычнага тэатра «Пасля пакарання смерцю—прашу...». 6 лютага ў Мінску пачаўся паказ лепшых юбілейных работ тэатраў.

АБ ВЯЛІКІМ БУРАВЕСНІКУ

Работнікі Мінскай масавай бібліятэкі зрабілі цікавую кніжную выстаўку «Буравеснік рэвалюцыі», прысвечаную 100-годдзю з дня нараджэння А. М. Горкага, афармілі плакат «Ілюстрацыі да твораў А. М. Горкага». Зараз яны рыхтуюць літаратурны вечар, прысвечаны вялікаму пісьменніку.

Бібліятэка добра супрацоўнічае з работнікамі кінатэатра «Мір», дзе кожны тыдзень выпускаецца радыёгазета, арганізаваны кіналекторый для моладзі «Яны былі першымі». Адна з радыёгазет будзе прысвечана жыццю і дзейнасці Горкага. Перад пачаткамі кінасеансаў работнікі бібліятэкі прачытаюць цыкл гутарак: «Дзяцінства і юнацтва Горкага», «Горкі ў перыяд першай рускай рэвалюцыі», «Савецкі перыяд у жыцці і творчасці Горкага», «Горкі—публіцыст і літаратурны крытык», «Горкі ў барацьбе за мір і дружбу народаў».

Акрамя таго, творчасці вялікага Буравесніка будзе прысвечана пасяджэнне маладзёжнага клуба «Далягляд», створанага па ініцыятыве бібліятэкі пры Доме мастацтваў.

КАБ НЕ ЗГАСАЛА НАТХНЕННЕ

СХОД ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ТЭАТРА ІМЯ М. ГОРКАГА АБМЯРКОЎВАЕ ВЫСТУПЛЕННІ ГАЗЕТЫ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА».

ВОСЬ зараз аўтобус кранецца з месца і павядзе артыстаў у наблізкую дарогу: прадстаіць выязны спектакль. Здаецца, усе ўжо сабраліся, аднак аўтобус чакае яшчэ кагосьці. Каго? Ніхто не ведае. Нарэшце, з'яўляецца акцёр, які ніколі ў гэтым спектаклі не іграў, але ў гэты вечар — на выязным — будзе замяняць таварыша, занятага сёння ж увечары на асноўнай сцэне. З'яўляецца гэты акцёр—і першае ж яго пытанне да калег: «Ну, і як мне яго паказваць?» Пакуль аўтобус даедзе да Барысава, акцёру растлумачаць, кім ён будзе, у якім гарнітуры, якія словы павінен гаварыць і да каго з імі звяртацца, адкуль і куды выходзіць...

— «Рэпетыцыя на колах у дарозе» — колькі іх, такіх вось, было ў нас!—з крыўдай гаворыць артыст К. Кулакоў.

А тут, на асноўнай сцэне? У Мінску, на вуліцы Валадарскага, 5—гледачы трапяць у цемнаваты і неправетраны гардэроб, пачакаюць трэцяга званка, потым раскрыецца заслона і...

Абшарпаныя дэкарацыі і калоны, якія хістаюцца, ніяк не могуць стварыць поўную ілюзію месца дзеяння. Калі яшчэ выканаўцы галоўных роляў іграюць на поўную моц свайго таленту, то другарадныя персанажы і кепска загрыміраваны, і звычайна мармычуць тэкст так, што ў зале шэптам пытаюць суседзяў: «Што ён сказаў?»

Гэта—словы народнага артыста БССР Р. Янкоўскага.

Чарговае прадстаўленне чарговага спектакля... А вось свята тэатра, пасля якога ўзніклі б спрэчкі і гледачы яшчэ доўга жылі б уражаннямі ад высокага мастацтва, не было ні ўчора, і ніхто з нас не ўпэўнены, што яно будзе сёння ўвечары.

Вядома, здараюцца і тут, у тэатры на вуліцы Валадарскага, хвіліны, а зрэдку — і гадзіны, калі на сцэне пануе сапраўдная творчасць. Але ж гэтыя пробліскі дзейснага мастацтва ўспыхваюць на фоне зусім шэрых будняў, што цягнуцца вось ужо не адзін год.

І нездарма, адкрываючы партыйны сход, на які сабраўся ўвесь калектыў, народны артыст рэспублікі Я. Палосін быў вымушаны зноў і зноў гаварыць пра тую надзвычай адказную ідэйна-творчую місію, што ўскладзена на рускую сцэну ў сталічным горадзе. Тут нельга мірыцца нават з адзіным крокам убок ад вялікага мастацтва. Вопыт пасляваенных гадоў паказвае, што такое мастацтва ствараецца не толькі ў сталіцах. У Брэсце і Панявежысе, у Паўлаве-на-Аіэ і ў Разанскім ТЮГ'у нараджаюцца спектаклі, якія маглі б, як кажуць, прынесці гонар любому тэатру. Ды і руская сцэна ў Мінску ў свой час набыла аўтарытэт сталага калектыву мастакоў-аднадумцаў, здольнага вырашаць самыя складаныя творчыя праблемы.

«У свой час...»

Як часта гучалі гэтыя словы ў выступленнях на партыйным сходзе! І ўспаміналася тая шчаслівая для трупы пара, калі па ўсёй краіне грымела слава «Брэсцкай крэпасці», «Варвараў», «Аптымістычнай трагедыі», «Караля Ліра», «Галоўнай стаўкі», «Узнятай цаліны»,—вядома, не для таго, каб яшчэ раз пакратаць кволае лісце лаўровых вянкоў,—не! З вышынь прынцыповых мастацкіх удач ацэньваўся сённяшні дзень, калі родны для большасці артыстаў дом апынуўся ў цяжкім становішчы, стаў няўтульным «домам без гаспадара».

— Калісьці кожны з нас горда называў сябе артыстам Рускага тэатра Беларусі, тэатра імя Максіма Горкага. Цяпер жа я, прызнацца, часам адчуваю няёмкасць, калі мне трэба сказаць некаму, дзе я працую,— шчыра і з болем гаварыла народная артыстка рэспублікі А. Клімава.—Хіба ж можна ганарыцца тым, што іграеш на падмостках, дзе лепш або горш больш за год настойліва спраўляецца «Вяселле на ўсю Еўропу», дэманструюцца пазбаўленыя якіх-небудзь вартасцей дэтэктыўныя гісторыі!.. Рэпертуар наш настолькі выпадковы, што наўрад ці можна ўвогуле назваць яго рэпертуарам. Маладыя акцёры і сталыя майстры ў нас не ведаюць, дзеля чаго ставіцца ў тэатры тая або іншая п'еса, навошта яму іграць менавіта гэтую ці іншую ролю і якія ў яго творчыя перспектывы хоць бы на сезон. Адны з нас заняты на сцэне штовечар, другія месяцамі атрымліваюць зарплату за бяздзейнасць. Узнікаюць хваравітыя ўзаемаадносіны, бо любы вымушаны «прастой» мастака прыніжае яго артыстычную годнасць і крадзе дарагі час. Дзіўна, але гэта так: мы трацім пачуццё адзінай—ў радасці і ў смутках—сям'і. Больш дакладна будзе сказаць: у нашай сям'і далёка не ўсё ў парадку. Між тым, святло рампы не ведае літасці, і прыгавор гледачоў абскарджанню не падлягае. Вось і здарылася, што тэатр губляе патрабавальнага гледача і спрабуе прыцягнуць сваім «рэпертуарам» аматараў бяздумнага смеху і «шпёнскіх перыпетый»—«касава» ўпаўне надзейных наведвальнікаў. Пры такім становішчы ўсё роўна, хто і каго іграе, што нясе акцёр як мастак, што мысліць і ці хвалюецца хваляваннямі часу.

Слухаючы А. Клімаву, я лішні раз пераконваўся, што лепшыя сілы нашай рускай сцэны перажываюць бяду, у якую трапіў пазбаўлены сталага мастацкага кіраўніцтва тэатр, як сваю асабістую. Глыбокая занепакоенасць агульным станам творчага жыцця тэатра—вось пафас адкрытага партыйнага сходу, які абмяркоўваў надрукаваныя ў «Літаратуры і мастацтве» артыкул А. Бутакова «Дом без гаспадара» і пісьмо ў рэдакцыю артыстаў К. Кулакова і І. Ліснеўскага. Трывогай былі насычаны выступленні і маладых артыстаў, якія параўнальна нядаўна яшчэ былі юнымі прыхільнікамі тэатра і пастаяннымі наведвальнікамі яго глядзельнай залы. Яна, гэтая ўстрывожанасць, ішла ад сэрца адданых свайму мастацтву працаўнікоў сцэны, калі гаворка пачыналася пра афішу, амаль да канца запоўненую «касава надзейнымі» назвамі, і калі ўзнікала ўнутраная патрэба ў споведзі мастака...

Горкія былі споведзі. Прыгадалі, скажам, як узрадаваліся акцёры, калі ў тэатры рашылі нанава прачытаць класічную «Любоў Яравую», паказаць яе—натхнёную, разумную і сапраўды наватарскую—як кастрычніцкую прэм'еру юбілейнага года. І—правал. На спектакль, пастаўлены з прэтэнзіяй на творчыя шуканні, з непатрэбнай пампезнасцю, публіка не пайшла. Крытыка слушна адзначыла сумбур у рэжысёрскіх акцэнтах і пэўны ідэйны «перакос» усяго спектакля.

— Але ўспомніце атмасферу, у якой мы працавалі над спектаклем, — сказала заслужаная артыстка БССР А. Шах-Парон.— Рэжысёр яшчэ толькі вывеў выканаўцаў роляў на сцэнічную пляцоўку, як адміністрацыя тэатра пачала «ўслых» сумнявацца ў поспеху пастаноўкі. Тут, мабыць, было б неабходна склікаць наша акцёрскае веча—мастацкі савет: паглядзець рэпетыцыі, абмеркаваць, па-сяброўску і прынцыпова прааналізаваць зробленае на першым этапе, даць парады... На жаль, і ў гэтым выпадку абышліся без калектыўнай думкі. Больш таго: удзельнікі «Любові Яравой», асабліва

[Працяг на 2-й стар.].

З выстаўкі «На сарце міру»

В. СУМАРАЎ. Ліст. (Масла).

ВА ЎДЗЯЧНАЙ ПАМЯЦІ НАШЧАДКАЎ

На рэспубліканскім аглядзе работы школьных музеяў, прысвечаным 50-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, музей Кузьмы Чорнага Цімкавіцкай сярэдняй школы Капыльскага раёна заняў трэцяе месца і ўзнагароджаны дыпломам. Гэта адзін з цікавейшых школьных музеяў у Беларусі.

Больш за тры гады ў вёсцы Цімкавічы, дзе прайшлі дзяцінства і юнацтва Кузьмы Чорнага дзейнічае літаратурны музей яго імя. Сабрана ўжо шмат цікавага, а вучні і настаўнікі з захапленнем працягваюць пошук матэрыялаў аб любімым пісьменніку. У розных кутні нашай Радзімы напісалі яны пісьмы, атрымалі дзесяткі адказаў на іх. Пішуць родныя, сябры, знаёмыя і нават тыя, каму давялося калі-небудзь чуць К. Чорнага ці толькі аднойчы сустракацца.

Зусім нядаўна атрыманы новыя экспанаты для музея. Гэта зборнік апавяданняў «Верасневыя ночы» выдання 1929 года з аўтографам Кузьмы Чорнага. Кнігу прыслаў Уладзімір Дубоўка. Атрыманы і фотакопіі канверта з адрасам А. А. Бабарэку, які напісаны рукой К. Чорнага, фотакопія старонкі з дзённіка ваенных гадоў, прысланыя жонкай пісьменніка (на гэтай старонцы напісана: «У вялікасці, сіле і славе жыві, родная зямля і родны народ»), фотакопіі ілюстрацый да «Зямлі», «Любы Лук'янскай» і інш.

Пад кіраўніцтвам дырэктара школы (яна ж і дырэктар музея на грамадскіх пачатках) З. Раманенкі падрыхтавана група экскурсаводаў, распрацавана некалькі лекцый: «Чорны — наш зямляк», «Кузьма Чорны — патрыёт сваёй радзімы, свайго народа», «Беларускі тэатр і драматургія Кузьмы Чорнага», «Савецкія пісьменнікі пра Кузьму Чорнага» і іншыя.

Сотні людзей пабывалі ў музеі. У кнізе водгукаў дзесяткі запісаў. Пішуць былыя вучні школы, настаўнікі і вучні іншых школ, былыя падпольшчыкі, пісьменнікі, журналісты. «Прыемна ўсведамляць, што светлая памяць аб выдатным земляку захоўваецца і шануецца ў Цімкавічах. Паклон шчодры зямлі Кузьмы Чорнага ад землякоў Януба Коласа», — запіс настаўнікаў Міхалаеўшчынскай сярэдняй школы Стаўбцоўскага раёна. А вось запіс, які пакінулі пісьменнікі В. Вітка, А. Русецкі, В. Дайліда: «З душэўным хваляваннем агледзелі мы музей, пабудаваны цярплівымі рукамі цімкавічаў, яніх любіў і славіў у сваіх цудоўных творах Кузьма Чорны. Вялікае дзякуй настаўнікам і вучням — слаўным землякам вялікага сына беларускай зямлі Кузьмы Чорнага, якія з любоўю захоўваюць яго памяць».

Калектыў Цімкавіцкай школы ганарыцца сваім дзецішчам, заўсёды клапоціцца аб ім. Ужо пачаты збор матэрыялаў для новых аддзелаў музея: «Капыльшчына ў гады дзяцінства Кузьмы Чорнага», «Родны край пасля рэвалюцыі».

Н. ДАВЫДЗЕНКА.

АД ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА І САВЕТА МІНІСТРАЎ СССР

Цэнтральны Камітэт КПСС і Савет Міністраў СССР з глыбокім жалем паведамляюць аб смерці выдатнага савецкага кінарэжысёра, члена Камітэта па кінематаграфіі пры Савеце Міністраў СССР, лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР, народнага артыста СССР Івана Аляксандравіча ПЫР'ЕВА, якая наступіла 7 лютага г. г. на 67-м годзе жыцця.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КПСС — САВЕТ МІНІСТРАЎ СССР

Тэатр

У СВЯТЛЕ РАМПЫ — ЛЕЙТЭНАНТ ШМІТ

«ПАСЛЯ ПАКАРАННЯ СМЕРЦЮ—ПРАШУ...» У ГОМЕЛЬСКІМ АБЛАСНЫМ ДРАМАТЫЧНЫМ ТЭАТРЫ

Сцэна са спектакля «Пасля пакарання смерцю — прашу...». Лейтэнант Шміт — арт. М. Пало, Зінаіда Іванаўна — арт. Р. Святлічная.

Фота Ул. МЯЖЭВІЧА.

Адразу скажу, што ішоў я на гэты спектакль з хваляваннем. І не толькі таму, што мяне зацікавіла п'еса. Калісьці мне давялося працаваць разам з вельмі патрабавальным і ўдумлівым рэжысёрам Іосіфам Паповым, і я назаўсёды, відаць, запомніў тыя гадзіны натхнення і шуканняў, што мы прысвячалі чарговым (падкрэслю гэта—чарговым!) спектаклям на гродзенскай сцэне. Цяпер ён працуе ў Гомельскім абласным драматычным тэатры. І яго творчая ўвага, скіраваная на п'есы, падобныя да драмы «Пасля пакарання смерцю—прашу...», мне вельмі зразумелая, бо гэты мастак з ліку тых, хто прагне рамантыкі, асабліва, калі на сцэне адлюстраваны рэвалюцыйныя надзеі.

Пабудавана п'еса на дакументах, пісьмах, тэлеграмах. Дакументальнасць яе падкрэслівае сам аўтар у падзагалоўку. Трэба сказаць адразу, што драматургу А. Доўгаму шмат у чым удалося дасягнуць сваёй мэты: дакументы сапраўды ў яго творы пераўтвараюцца ў сюжэтную драматургію.

Лейтэнант Шміт...

Гэтае імя — легенда. Толькі тэатр не мае права спадзявацца, што легенда аўтаматычна забяспечыць яму цікавае і драматычна напружанае відовішча. Тым больш, што ў дадзеным выпадку дзея пабудавана на суцэльным дыялогу (калі быць больш дакладным—на дыялогу ў пісьмах). Іграць такі спектакль надзвычай цяжка, можаце мне паверыць як акцёру. І да гонару тэатра і рэжысёра І. Папова трэба аднесці тую творчую адвагу, з якой яны ўзяліся пераадолець цяжкасці—і пераадолелі. Спектакль глядзіцца з незвычайнай увагай, гледачу цікавыя ўсе перыпетыі сюжэта.

Я ўпэўнены, што рэжысёр І. Папоў зрабіў зусім правільна, калі пачаў спектакль з таго моманту, якому, мабыць, і не абавязкова быць пралогам: Вядучы чытае завяшчанне адважнага рэвалюцыянера, дзе той просіць, каб на яго магіле была выбіта тая клятва, якую даваў ён народу перад паўстаннем, і каб развіваўся на ветры сцяг чырвонага колеру, колеру Рэвалюцыі.

Гэта адразу вызначае ідэйны і эмацыянальны пафас прадстаўлення, і тыя інтымныя пачуцці, што звязваюць паміж сабою двух людзей, мабыць, зусім рэдкай духоўнай чысціні — Паўла Пятровіча Шміта і Зінаіду Іванаўну,—набываюць адразу трагедыйную афарбоўку.

Не кожны рэжысёр возьмецца ставіць п'есу, дзе прадстаўлены такія рэальныя фігуры, як цар Мікалай Другі, пісьменнік Аляксандр Купрын і рэвалюцыйны марак Пётр Шміт, розныя генералы, дзяржаўныя дзеячы, чые імёны вядомы цяпер амаль што кожчаму гледачу—ці то па тэлеперадачах, ці то па мемуарнай літаратуры. Тым больш, што ў драме «Пасля пакарання смерцю — прашу...», шчыра кажучы, ролі напісаны так, што псіхалагічнае апраўданне кожнаму ўчынку і кожнай думцы персанажаў не лёгка знайсці нават самаму вопытнаму акцёру: сціслы тэкст тэлеграмы, блытаніна інтымнага пісьма, сухая мова паліцэйскага паведамлення або даноса шпіка... Як акцёр, мушу сказаць, што іграць п'есу не толькі цяжка,—гэта з тых творчых разведак, якія сведчаць пра мастацкую сталасць і рэжысуры, і ўсяго артыстычнага складу тэатра.

Мяне ўразіла тое калектыўнае пачуццё адказнасці перад гледачамі, якім жывуць усе выканаўцы галоўных і эпізадычных роляў у спектаклі гамяльчан. Я адчуў і потым быў захоплены духам калектывізму ў творчасці, што пануе на сцэне з таго моманту, калі адкрываецца заслона і гучаць самыя першыя словы, і да самага фіналу.

Характар... Вось пра што марыць кожны з нас, акцёраў, калі выходзіць у святло рампы. І яны, характары, створаны ўдзельнікамі гэтага прадстаўлення з тым вострым малюнкам, дзе мастацкая праўда суладная з жыццёвай, дзе публіцыстычная скіраванасць тэатральнага відовішча спалучана з гранічнай праўдападобнасцю ў паводзінах усіх персанажаў—ад галоўных да другарадных.

Я забыў пра тое, што і сам бы, відаць, мог іграць Пятра Шміта, і з напружаным хваляваннем сачыў за кожным яго крокам—не, не па сцэне!—па турэмнай камеры, па вагону пасажырскага поезда і ўсюды, дзе дзейнічаў герой... Іменна за ім, за лейтэнантам-рэвалюцыянерам, а не за артыстам М. Пало. Якія сцэнічныя задачы ў кожным асобным выпадку ставіў перад выканаўцам рэжысёр І. Папоў—не ведаю, але ўсе яны зліліся ў пераканаўчую лінію паводзін канкрэтнага чалавека, чыё душэўнае харавство выклікае пачуццё ўдзячнасці—добра, што такія людзі ў рэвалюцыі заўсёды ёсць!

Мне былі асабліва дарагія тыя хвіліны цішыні, калі зала і сцэна, як кажуць, жылі адзіным навальнічным паветрам. Фехтавальная трапнасць рэплік-удараў, маляўнічая мова, свабоднае выяўленне пачуццяў, часам загнаных у патаемныя куткі душы, а часам вулканічна шумных,—усё, што толькі ўвайшло ў палітру мастакоў, якія склалі ансамбль выканаўцаў, прымушала мяне забыцца на тое, што я—у тэатры. Праўда, у асобных сцэнах, як гэта ні дзіўна будзе для артыстаў, мне хацелася б бачыць больш мастацкай аскетычнасці. Магчыма, М. Пало ў вобразе лейтэнанта Шміта варта пазбягаць тае «ўсмешлівасці», што робіць з яго прыемнага субяседніка, але трохі згладжвае небяспеку рэвалюцыйнай дзейнасці ва ўмовах падполля (асабліва ў першай частцы спектакля). Герой пакутуе ад таго, што вечнае і запаветнае каханне прыйшло да яго амаль што напярэдадні пакарання смерцю,—і няма часу разабрацца, наколькі яно ўзаемнае і роўнае. Артысту неабходна больш дакладна вызначыць акцэнты ў эмацыянальным стане лейтэнанта Шміта ў кожную хвілю яго сумненняў і спадзяванняў.

Пакуль што не знайшоў сябе, на маю думку, малады артыст Я. Дашкоў (Жэня Шміт). Ён не пераконвае мяне ў эпізодзе развітання з бацькам, хоць на працягу ўсяго «жыцця на сцэне» абяцае вельмі цікавае псіхалагічнае вырашэнне і гэтай трагедыйнай сцэны. Магчыма, гэта ўвогуле цяжка—паказаць, як хлопчык ператвараецца ў мужчыну, у барацьбіта. Калі Я. Дашкоў здолее ўзняцца да таго напалу пачуццяў, якім жыве ў гэтым эпізодзе выканаўца ролі лейтэнанта Шміта, будзе дасягнута істотна важная сцэнічная мэта.

Зразумела, мне тое-сёе ў спектаклі І. Папова здаецца не такім, якім я бачыў, прачытаўшы п'есу А. Доўгага. Мы, відаць, спрачаліся б з рэжысёрам. Але катэгарычным я быў бы толькі ў адной прэтэнзіі: плакатныя вырашэнні асобных сцэн і вобразаў не зусім адпавядаюць сутнасці драмы лейтэнанта Шміта і яго паплечнікаў. Гэта датычыць, напрыклад, эпізодаў суда. Яны маглі б знайсці больш абгрунтаванае ўнутранае тлумачэнне, калі б пастаноўшчык не апынуўся ў палоне стандартна прыўзнятага апафеозу — фіналу.

Праўда, гэта ўжо ў самым канцы спектакля. І мы, гледачы, даруем празмерна ўрачысты заключны эпізод, бо пазнаёміліся з жывым і прывабным вобразам героя, чыё жыццё было звернута ў будучыню, да нас. Я, як акцёр, нават зразумеў, свайго калегу Ул. Ткачэнку — ён іграе не толькі імператара Мікалая II, але і свае адносіны да гэтай асобы. Відаць, гэта вельмі цяжка—ды і спрэчна—іграць спектакль пра тое, што было ў краіне напярэдадні Кастрычніка, і не выказаць адкрыта сваіх адносін да тых, хто быў змецены з гістарычнай арэны магутным народным рухам.

Спектакль гамяльчан мне ўяўляецца значным крокам у пошуках рэпертуарных навінак і авалоданні складанай тэмай. Тэатр выступіў арыгінальным інтэрпрэтатарам цікавай п'есы. Што да маіх заўваг, то гэта—пажаданні, каб усё на сцэне было яшчэ лепш.

Юрый СІДАРАЎ,
заслужаны артыст БССР.

НА ГЛЕБЕ НАРОДНАЙ

ДА СТАГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ КАРУСЯ КАГАНЦА

ГАДОЎ шэсцьдзесят таму назад на вуліцах губернскага Мінска можна было сустрэць прысадзістага барадатага чалавека. Зімою ён быў у жоўтым кажусе, падпераразаным поясам, у высокай аўчыннай шапцы, у юхтовых ботах. Улетку таксама нічым асабліва не вылучаўся сярод сялян з-пад Койданава, хіба толькі тым, што паверх палатнянай кашулі нязменна насіў суконную світку, каб не так кідаўся ў вока горб. З усімі, нават з панамі і падпанкамі, гаварыў ён толькі па-беларуску. Ва ўсёй яго постаці і ў абліччы адчувалася моцная сіла волі.

Так выглядаў Карусь Каганец—вядомы беларускі паэт, празаік, драматург, дзіцячы пісьменнік, аўтар першых беларускіх падручнікаў, перакладчык, здольны мастак і скульптар.

Карусь Каганец—гэта псеўданім Казіміра Карлавіча Кастравіцкага. Нарадзіўся ён сто гадоў таму назад, 10 лютага 1868 года, у Табольску. Бацька яго—стрыечны брат Міхала-Апалінарыя Кастравіцкага, дзеда вядомага французскага паэта Гійома Апалінэра—за ўдзел у паўстанні 1863 года быў высланы ў Сібір. Неўзабаве Кастравіцкія атрымалі дазвол вярнуцца на радзіму, у Беларусь; ехалі на санях з Табольска ажно да Масквы, а пасля цягніком да Мінска.

Прытулак знайшлі ў вёсцы Засулле, недалёка ад Стоўбцаў. Бацька ў хуткім часе памёр, малому Казіміру прыйшлося наняцца пастухом. Потым Кастравіцкія жылі ў Прымагіллі (Юцкох) каля Койданава, аралі зямлю, якую ўступіла бедная ўдаве яе родная сястра. Казімір вучыўся дома, пасля ў Мінскім гарадскім вучылішчы, скульптурным майстэрствам авалодваў у Маскве і Пецярбурзе, але навукі там не закончыў, бо не было сродкаў.

У 1899 годзе К. Каганец ажаніўся і асеў ва ўрочышчы Лісія Норы ля Прымагілля. Зямля там была пясчаная, збожжа радзіла кепска, гэта прымусіла шукаць іншага заробку: ён працаваў у мастацкай майстэрні ў Рызе і Мінскім таварыстве дабрачыннасці, служыў дзесятнікам у Лідзе на будаўніцтве чыгункі. За агітацыйную дзейнасць сярод сялян Койданаўшчыны трапіў у снежні 1905 года ў Мінскую турму, у чаканні суда праседзеў там да мая 1906 года. Потым працаваў у Вільні настаўнікам малявання, у лясніцтве ля Клічава.

Вясною 1910 года Віленская судовая палата прыгаварыла К. Каганца да зняволення ў Мінскай крэпасці, дзе ён адседзеў год, пачынаючы з 26 ліпеня 1910 г. Захаваліся яго лісты з турмы, адрасаваныя жонцы. З гэтых неапублікаваных лістоў відаць, што К. Каганец у зняволенні не падаў духам, займаўся творчымі справамі, пісаў і маляваў (дарэчы, сядзеў ён у турме разам з Я. Коласам).

Пасля турмы К. Каганец доўга быў беспрацоўным, толькі ў 1912 годзе атрымаў, нарэшце, службу ў фальварку Жортай на Барысаўшчыне. Памёр Карусь Каганец 20 мая 1918 года ў Прымагіллі, пахаваны ў вёсцы Навасёлкі.

Большая частка жыцця Каруся Каганца прайшла ў беларускай вёсцы, сярод працоўнага сялянства. Сам ён пісаў: «Разам пасвіў, разам гуляў, разам працаваў і цяпер маю між імі сваякоў». Гэта акалічнасць наклала свой адбітак на яго паэзію (пісаць пачаў К. Каганец у 1893 годзе). У ранніх вершах — простыя і шчырыя малюнкі сялянскай працы і народнага побыту, скарга на нялёгкую долю («Наша ніўка», «На сяле вечарамі», «Плач беларуса», «Песня зіме», «Жняя», «Аратай» і інш.). Часам ціхая скарга пераходзіць у заклік:

Адважна, браццы, наперад ідзіце
Цвёрдай і правай ступою!
Кожнаму смела ў вочы глядзіце,
Праўду нясіце з сабою!
За родну краіну, звычай і мову
За гонар грудзёю ставайце!

(«Наш сымболь», 1893).

Пісаў К. Каганец вершы на гістарычныя тэмы («У тры шляхі ідуць ляхі», «Нёман», «Сцяты камень», «Пра пана Ленскага», «Пра Галубка» і інш.). Паэзія яго вырастала на народнай глебе, на песеннай творчасці, і там, дзе К. Каганец творча выкарыстоўваў фальклорныя здабыткі, з'яўляліся сапраўды ўдалыя вершы («Ой, у полі вецер», «Выйду на гару высоку»).

Яшчэ больш арыгінальны Карусь Каганец як празаік, драматург і аўтар навукова-папулярных нарысаў для дзяцей. Працу ў галіне прозы ён пачаў з бытавых апавяданняў—«З нашага жыцця», «Тры алешыны», «На сплаве», «Забойства ў пушчы». Гэтыя творы вызначаюцца не толькі трапнымі назіраннямі, у іх выразна адчуваецца сацыяльнае завастрэнне. Яркія і каларытныя малюнкі беларускай прыроды паўстаюць у творах «Восеню», «Першы снег». К. Каганец шмат увагі аддаваў апрацоўцы беларускіх народных казак («Жураўель і чапля», «Скрыпач і ваўкі», «Што кажух, то не вата») і мясцовых легенд («Навасадскае замчышча», «Прылукі», «Вітаўка»). Пра гэтыя апрацоўкі М. Багдановіч пісаў: «Рэзка індывідуальную фізіяномію маюць творы К. Каганца, ад якіх вее паганскай Руссю».

Карусь Каганец—аўтар вядомага вадэвіля «Модны шляхцюк» (1910), у якім ярка і жыва адлюстравана жыццё беларускай засцянковай шляхты. Трапны сатырычны вобраз «моднага шляхцюка» Пранцішка Карчэўшчыка, дынамізм дзеяння, багатая народная мова — усё гэта спрыяла выключнаму поспеху вадэвіля. Цікава адзначыць, што купалаўская «Паўлінка» (1912) пераклікалася з вадэвілем К. Каганца; праўда, яна з'явілася больш дасканалым і майстэрскім творам на тую ж тэму, што ўздымаецца ў «Модным шляхцюку». Працаваў К. Каганец і над іншымі драматычнымі творамі, якія на жаль, засталіся няскончанымі («У іншым шчасці няшчасце схавана», «Старажовы курган» і «Сын Данііла»).

Трэба сказаць і аб тым, што аўтар «Моднага шляхцюка» разгортваў шырокую і актыўную асветніцкую дзейнасць. У 1905 годзе К. Каганец меркаваў арганізаваць выданне беларускай газеты «Палессе», але не атрымаў на гэта дазволу царскіх улад. Ён склаў «Беларускі лемантар або Першую навуку для чытання»—першую кнігу, якую выдала суполка «Загляне сонца і ў наша ваконца» (1906), па прапанове суполкі рыхтаваў чытачку, збіраў матэрыялы да слоўніка беларускай мовы, меркаваў напісаць граматыку. К. Каганец быў адным з перакладчыкаў кнігі «Гутаркі аб небе і зямлі» (Пецярбург, 1907), у якой зрабіў першыя крокі ў распрацоўцы беларускай навуковай тэрміналогіі. Цікавымі ўзорамі навукова-папулярнага артыкула для юнага чытача былі яго нарысы «Нашы птушкі, «Вандроўка кроплі вады».

К. Каганец—таленавіты жывапісец, графік і скульптар. Яшчэ ў часе вучобы ў Маскоўскім мастацкім вучылішчы ён вылепіў галаву Івана Грознага. Гэта ранняя скульптурная праца была вельмі высока ацэнена яго настаўнікамі. Пасля ён выразаў з дрэва і слановай косці. К. Каганец пакінуў цікавыя малюнкі беларускіх тыпаў («Маці», «За сахой», «На ростаньках»), зрабіў вокладку да кнігі Я. Коласа «Другое чытанне для дзяцей беларусаў». Шкада, што большасць малюнкаў і скульптурных прац, відаць, беззваротна загінула.

Творчая спадчына К. Каганца раскідана ў розных беларускіх газетах і часопісах, цікавыя неапублікаваныя лісты яго за 1899—1912 гг. знаходзяцца ў аддзеле рэдкай кнігі і рукапісаў Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Леніна. Даўно пара лепшае са спадчыны пісьменніка сабраць і выдаць асобнай кнігай. Гэта будзе лепшым ушанаваннем памяці слаўнага сына беларускай зямлі, аднаго з паплечнікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Сцяпан АЛЕКСАНДРОВІЧ.

ЯНЫ ПРЫНЯТЫ Ў САЮЗ КАМПАЗІТАРАЎ

ЦЕСАКОЎ Кім Дзмітрыевіч. Нарадзіўся ў 1936 годзе на Міншчыне. Музычную адукацыю атрымаў у Новасібірскай дзяржаўнай кансерваторыі, якую скончыў у 1965 годзе па класу кампазіцыі. Зараз працуе выкладчыкам музычна-тэарэтычных дысцыплін у Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі і Мінскім музычным вучылішчы.

К. Цесакоў — аўтар дзвюх сімфоній, сімфанічнай паэмы «Тарас на Парнасе», струннага трыо, струннага квартэта, вакальнага цыкла «Зямля мая», твораў для хору, рамансаў, песень, інструментальных твораў.

ЯНЧАНКА Алег Рыгоравіч. Нарадзіўся ў 1939 годзе ў Маскве. Музычную адукацыю атрымаў у Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі. Стажыраваўся ў Венскай акадэміі музыкі і спецыяльнай акадэміі для арганістаў у Харлеме (Галандыя). На Міжнародным конкурсе арганістаў імя Баха ў Лейпцыгу атрымаў дыплом.

Сярод твораў А. Янчанкі — сімфонія-араторыя «Эроіка», канцэрты для аргана, фартэпіяна, цымбалаў з сімфанічным аркестрам, кантата «Беларускія сосны», дзіцячая опера «Мыйдадзір», дзіцячая сюіта «Дзюймовачка», струнны квартэт.

МУЗЫЧНАЯ СТУДЫЯ Ў КАЛГАСЕ

Вёска Стасеўка Бабруйскага раёна — цэнтр калгаса імя Фрунзе. Сельгасарцель пабудавала тут вялікі і прыгожы клуб. У ім працуюць харавы, танцавальны, драматычны і музычны гурткі. Нядаўна ў клубе па ініцыятыве старшыні калгаса М. Куліка адкрыта дзіцячая музычная студыя па класу баяна. Заняткі ў ёй вядзе загадчык клуба І. Коршак.

А. ДЗМІТРЫЕЎ.

МІЁРСКІ ДРАМАТЫЧНЫ

Плённым быў леташні год для драматычнага калектыву Міёрскага раённага Дома культуры. Аматары сцэны пазнаёмілі гледача з пяццю спектаклямі па п'есах савецкіх драматургаў. Апошняя работа калектыву — пастаноўка «Дваццаць год назад» М. Святлова. У спектаклі заняты самадзейныя артысты М. Абалевіч, А. Будзько, І. Каснарэвіч, В. Бышнеў, М. Хадасевіч. Добра паказалі сябе дэбютанты-камсамольцы А. Варавец і Ф. Трашчынскі.

Цяпер міёрцы рыхтуюць два новыя спектаклі—«Трое» А. Ларчанкава аб нашым сучасніку і аднаактавую камедыю на атэістычную тэму І. Штока «Чортаў млын».

В. СІВІЦКІ.

КАБ НЕ ЗГАСЛА НАТХНЕННЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

такія, як я, што гадамі чакалі ролі (а мне даручылі іграць Паўлу Панову), адасобіліся ад скептыкаў і ўпарта супроцьстаўлялі ім сваё бачанне спектакля. Нам хацелася давесці ўсім—і, як ні дзіўна гэта, раней за ўсё дырэкцыі тэатра,—што мы ўмеем працаваць і верым рэжысёру. Але канфлікт паміж дырэктарам Полаўцам і тагачасным галоўным рэжысёрам Даброціным перашкаджаў нармальна рэпеціраваць і асуджаў прэм'еру на правал...

Што ж, калі паслухаць такія выступленні, дык трэба рабіць зусім дзіўныя высновы: быццам самі ж супрацоўнікі тэатра, бывае, ствараюць скандальныя умовы, у якіх і сапраўдная драматургія не можа знайсці вартага ідэйна-мастацкага ўвасаблення? Ці справядліва адрасаваць усе папрокі за правал юбілейнага спектакля аднаму рэжысёру? Бо і на самой справе здзіўляе факт, што прэм'еру ігралі акцёры, для якіх ролі ў «Любові Яравой» былі іх даўняй творчай марай,—і ўсё ж такая патрэбная прэм'ера не прынесла ні поспеху, ні артыстычнага задавальнення.

Я слухаў такія выступленні і губляўся: няўжо этыка тэатра пакінула сцэны ў будынку на вуліцы Валадарскага, 5? Творчыя кампрамісы, частая змена кіраўніцтва — і адміністрацыйнага і творчага, — цякучка ў складзе акцёрскай трупы і работнікаў дапаможных цэхаў, пагоня толькі за фінансавым поспехам, адсутнасць рэпертуарнага плана, які б прадугледжваў інтэнсіўную творчую дзейнасць кожнага артыста, — усё гэта стала атмасферай жыцця тэатра. І ў мяне, калі я слухаў выступленні, склалася такое ўражанне, быццам у адны калёсы кіраўніцтва гэтым калектывам у апошні час часцей, чым гэта дапушчальна, запрэжанымі бываюць працавіты конь матэрыяльнага разліку і трапяткая лань творчасці. Мабыць, такое і неабходна, але да пэўных межаў. Чаму ж перамагае пакуль што толькі конь, які робіць справаздачу з лічбамі на паперы—абслужана столькі гледачоў, сабрана столькі рублёў, надрукавана столькі станоўчых водгукаў-рэцэнзій?.. Бо і лань мае права на перамогу.

Так цягнуцца доўга не можа. І я разумею тое справядлівае абурэнне, з якім заслужаная артыстка БССР Л. Весніна гаварыла пра факты ўмяшальніцтва ў творчы працэс людзей, якія па сваіх службовых абавязках павінны займацца выключна адміністрацыйнай работай.

Была ў выступленнях на партыйным сходзе яшчэ адна заклапочанасць — з поваду таго, што ў калектыве губляецца пачуццё агульнай адказнасці за лёс тэатра, артыста, спектакля. Народныя артысты БССР Г. Абуховіч, А. Клімава і Р. Янкоўскі, заслужаныя артысты рэспублікі І. Ражба, М. Кузьменка, М. Сокал, А. Ільін, А. Шах-Парон, Ю. Сідараў, драматург П. Харкоў, заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР рэжысёр А. Даброцін, загадчык дэкаратыўнага цэха Р. Чысты, акцёры К. Кулакоў, В. Мароз, І. Камароў, Т. Кудраўцава, хто больш падрабязна, хто менш, але абавязкова спыняліся на ролі мастацкага савета. Грамадскія арганізацыі тэатра чамусьці дазволілі дырэкцыі зусім ігнараваць гэты калегіяльны орган пры вырашэнні кардынальных пытанняў творчага жыцця. Прасцей кажучы, адміністрацыя з ім проста не лічылася—ні тады, калі складала рэпертуарныя планы, ні калі запрашала ў трупу новых супрацоўнікаў, ні калі вызначала выканаўцаў нават галоўных роляў у найбольш значных спектаклях.

Добра, што члены мастацкага савета былі на сходзе самакрытычнымі і прызнавалі: хацелі яны таго ці не, але атрымлівалася так, што выступалі ўсё ж маўклівымі патуральнікамі свавольства адміністрацыі — рэдка і выпадкова збіраліся, пагаджаліся з «касавымі» меркаваннямі дырэкцыі, не адвяргалі з неабходнай ваяўнічасцю пасрэдныя п'есы, якія прапаноўвала тэатру літаратурная частка.

— Ды, зрэшты, ці мае права гаварыць пра які-небудзь аўтарытэт наш цяперашні памочнік галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы? — спытаў Ю. Сідараў. — Пісьменнік Мікалай Гарулёў працуе ўжо два гады на ганаровай, але і надзвычай адказнай пасадзе. Гэта ад яго апэратыўнасці, густу, дасведчанасці ў галіне сучаснай драматургіі залежыць адбор лепшых твораў у рэпертуар нашага тэатра. Асабліва ўзрастае яго роль, калі калектыў працуе без сталага мастацкага кіраўніка. Я ўспамінаю дзейнасць тэатра за апошнія два гады і, на жаль, не магу прыгадаць выпадку, які сведчыў бы пра дапытлівасць і ўдумлівае стаўленне нашай літчасткі да навінак драматургіі і да рэпертуарнай палітыкі ўвогуле. Выпадковасць гаспадарыць і тут. Мірыцца з гэтым нельга, бо кірунак творчага жыцця і лёс акцёрскай трупы вызначае, як кажуць, афіша, назвы на ёй. Нам сённяшняя афіша не да твару!

Сход працягваўся два дні. І гаварылася на ім пра набалелае. Прынцыпова, патрабавальна і самакрытычна. Нямала горкіх слоў пачулі кіраўнікі грамадскіх арганізацый тэатра, бо партыйны камітэт і мясцовы камітэт прафсаюза яшчэ не ўплывалі належным чынам на творчае жыццё, у прыватнасці, не памаглі мастацкаму савету заняць належнае месца ў жыцці трупы. Выступаючыя таварышы абураліся тым, што і да гэтага часу адміністрацыя спрабуе выцягнуць на сцэну слабую ва ўсіх адносінах камедыю М. Гарулёва «Помста Палавінкіна» і марудзіць выпуск прэм'еры п'есы «Першы ўрок» К. Губарэвіча, якая магла быць паказана яшчэ ў мінулым годзе, да кастрычніцкіх свят. Наказам мастацкаму савету прагучаў заклік удзельнікаў сходу скласці змястоўны рэпертуар гэтага года, калі Савецкая Беларусь рыхтуецца адзначыць паўвекавы юбілей свайго нараджэння. Гэта — галоўны сённяшні клопат калектыву.

У сходзе прынялі ўдзел намеснік міністра культуры БССР Ю. Міхневіч, прадстаўнікі партыйных і грамадскіх арганізацый горада.

І калі мы ўвечары (на сцэне ўжо ішоў спектакль) разыходзіліся з тэатра, у нас была ўпэўненасць, што такое шырокае і зацікаўленае абмеркаванне павінна абавязкова прынесці карысць гэтаму багатаму на яркія таленты калектыву, здольнаму з поспехам вырашаць самыя складаныя творчыя задачы.

Барыс БУР'ЯН.

У ПАСТАНОВЕ СХОДУ ГАВОРЫЦЦА...

Сакратар партыйнага бюро Дзяржаўнага Рускага тэатра БССР імя М. Горкага Ю. Сідараў паведаміў рэдакцыі, што адкрыты сход партарганізацыі тэатра, абмеркаваўшы артыкул «Дом без гаспадара» А. Бутакова і пісьмо «Няўтульна ў родным доме», надрукаваныя ў газеце «Літаратура і мастацтва» ў верасні (№ 76) і снежні (№ 100) 1967 года, прызнаў іх асноўныя палажэнні правільнымі і намеціў рад мер, накіраваных на паляпшэнне творчага жыцця калектыву.

У апошнія гады, гаворыцца ў пастанове сходу, тэатр адышоў ад тых творчых пазіцый, што былі заваяваны ім настойлівай шматгадовай працай; у клопатах пра часовы фінансавы поспех паставіў значную колькасць слабых п'ес («Бездакорная рэпутацыя», «Лёс-індычка», «Куды ідзеш, Сяргей?», «Шчыт і меч», «Помста Палавінкіна»), не дасягнуў належнага ідэйна-мастацкага ўзроўню ў спектаклях па такіх творах, як «У дзень вяселля», «Любоў Яравая», «Звычайная гісторыя». Кіраўніцтва тэатра не здолела арганізаваць нармальны творчы і вытворчы працэс, у выніку чаго, напрыклад, з мая па снежань мінулага года не было паказана ніводнай прэм'еры. Бясплановасць вядзе да таго, што адны акцёры бываюць доўгі час без працы, а іншыя — перагружаны. Больш чым год спектаклі ідуць без рэжысёрскага нагляду і на сцэне з'яўляюцца правінцыялізм і безгустоўнасць, а часам і пошласць.

Пры вырашэнні пытанняў камплектавання трупы дырэкцыя тэатра ігнаруе мастацкі савет, партарганізацыю і мясцовы камітэт. Насуперак неаднаразовым абяцанням кіраўніцтва не наладзіла сувязі з Беларускім тэатральна-мастацкім інстытутам. Па-ранейшаму ў складзе творчых работнікаў застаюцца ненармальныя суадносіны паміж колькасцю акцёраў-мужчын і жанчын.

Да гэтага часу тэатр не мае рэпертуарнага плана на юбілейны для рэспублікі год. І ў гэтым вялікая віна памочніка галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы М. Гарулёва, які не клапоціцца аб забяспячэнні рэпертуару новымі арыгінальнымі творамі.

Перашкаджае нармальнай працы тое, што тэатр не мае галоўнага рэжысёра. Тыя рэжысёры, што ад выпадку да выпадку запрашаюцца з іншых тэатраў, не здольны планаваць раўнамерную загрузку творчага складу, адносяцца да акцёрскіх індывідуальнасцей па-спажывецку. Вялікія патэнцыяльныя магчымасці трупы застаюцца не раскрытымі.

Партыйны сход пастанавіў прасіць Міністэрства культуры БССР звярнуць асаблівую ўвагу на трывожнае становішча спраў у тэатры, у прыватнасці, дапамагчы ўкамплектаваць трупу рэжысёрскімі кадрамі.

Дырэкцыі сумесна з партбюро прапанавана неадкладна выпрацаваць рэпертуарны план да студзеня 1969 года, уключыўшы ў яго п'есы, вартыя знамянальнай даты — 50-годдзя Савецкай Беларусі.

Далей у пастанове гаворыцца:

рашуча ўзняць ролю мастацкага савета, каб ні адно важнае творчае пытанне не вырашалася без яго ўдзелу;

павысіць адказнасць кіраўніцтва тэатра, партбюро і мастацкага савета за ідэйна-мастацкую якасць п'ес, што прымаюцца да пастаноўкі, і спектакляў;

запатрабаваць ад дырэкцыі, каб без рашэння мастацкага савета яна не прымала ў трупу новых артыстаў;

пры камплектаванні трупы аддаваць перавагу моладзі, наладзіўшы цесную сувязь з Беларускім тэатральна-мастацкім інстытутам.

У майстэрнях мастакоў

Песня пра Ліду



Гэта было ўжо даўно.

Каравашкіна выклікаў камандзір палка, прапанаваў:

— Сядайце, Уладзіслаў Канстанцінавіч. Курыце...

Каравашкін прыкурыў, зацягнуўся.

— Вы ўжо семнаццаты год у арміі?

— Калі лічыць з ваеннай школай — так...

— Ваенна-медыцынская камісія прызнала, што пасля кантузіі вы служыць болей не здолееце. У вас ёсць цывільная прафесія?

— Не.

— Гэта горш... Атрымаеце пенсію... Галоўнае — не падайце духам, вы ж камуніст.

У той жа вечар у Каравашкіна сабраліся сябры. Думалі, раілі.

Нехта прыгадаў:

— Ты ж захапляўся жывапісам. Бярыся за яго ўсур'ёз!..

Неўзабаве Уладзіслаў Каравашкін пераехаў з сям'ёй у Ліду і стаў працаваць мастаком у Доме культуры. Работы было многа: стэнды, плакаты, афармленне выставак у падшэфным калгасным клубе. А ў вольныя хвіліны Уладзіслаў браў эцюднік і пісаў пейзажы. Па вечарах чытаў спецыяльную літаратуру, займаўся самаадукацыяй.

Праца і вучоба далі добрыя вынікі: не так даўно ў Гродна на выстаўцы твораў самадзейных мастакоў вобласці Уладзіслаў Каравашкін паказаў цікавыя творы розных жанраў. У яго работах «Вечар на Нёмане», «Лідскі парк», «Зімовы вечар» вабіць пачуццё любві да роднага краю. Спадабалася гледачам і «Песня пра горад Ліду». На першым плане тут паказана маладая дзяўчына, а на другім — новабудоўлі, стрэлы пад'ёмных кранаў, людзі ў жалобным маўчанні ля Кургана Бяссмерця...

Работы Ул. Каравашкіна экспанаваліся і ў Мінску, на рэспубліканскай выстаўцы. Прызнанне атрымалі «Песня пра горад Ліду» і «Брэсцкая крэпасць». Станоўча адгукнуліся аб гэтых работах мастакі-прафесіяналы, мінскія і маскоўскія мастацтвазнаўцы. А ў Уладзіслава Каравашкіна ўжо новыя планы, задумы. Ён збіраецца ў падарожжа па Прынёманскім краі, па гістарычных мясцінах Гродзеншчыны. Значыць, будуць новыя пошукі, новыя работы.

Ул. ДЗЕМІН.

ВЫСТАЎКА Ў БІБЛІЯТЭЦЫ «ЮНАЦТВА»

У мінскай бібліятэцы «Юнацтва» нядаўна адкрылася выстаўка работ беларускіх графікаў. Члены клуба аматараў літаратуры і мастацтва «Ліра» з цікавасцю пазнаёміліся з акварэлямі Л. Лейтмана, афортамі В. Ціхановіча, лінагравюрамі М. Моўчана, А. Паслядовіч, А. Кашкурэвіча, ілюстрацыямі да беларускіх дзіцячых народных песень А. Лось і Г. Якубені і інш.

На наступных пасяджэннях члены клуба азнаёмяцца з другімі відамі беларускага выяўленчага мастацтва: пейзажам, партрэтам, ілюстрацыямі да твораў беларускіх пісьменнікаў.

ЧАСОПІСЫ ў люстры

ПОЛЫМЯ · БЕЛАРУСЬ · МАЛАДОСЦЬ

«МАЛАДОСЦЬ» У раздзеле паэзіі — вершы Ул. Паўлава, М. Панасюка, Я. Шабана, А. Вярцінскага, М. Смагаровіча, А. Казловіча.

Часопіс друкуе аповесць Г. Бураўкіна «Тры старонкі з легенды», апавяданні А. Сідарэвіча, С. Шушкевіча і У. Аляхновіча.

Пад загалоўкам «З намі гутарыць Горкі» (да 100-годдзя з дня нараджэння) змешчана падборка парад Горкага маладым літаратарам.

Пад рубрыкай «Дыялогі і маналогі» — гутарка з Я. Скрыганом пра майстэрства апавядальніка.

Змешчана таксама нататка І. Навуменкі пра апавяданне М. Гарэцкага «Літоўскі хутарок».

У раздзеле «Публіцыстыкі» чытачы знойдуць успаміны генерал-палкоўніка артылерыі М. Дзмітрыева «Пераможныя залпы на Волзе», нататку Ф. Собаля пра поўнага кавалера трох ордэнаў славы М. Лебедзева, архіўныя матэрыялы пра дапамогу працоўным Беларусі пры фарміраванні першых чырвонаармейскіх атрадаў, каляндар знамянальных дат з гісторыі Беларусі, матэрыялы пад рубрыкамі «Для вас, дзесяцікласнікі», «Сур'ёзнае і кур'ёзнае», «Усмешкі маладосці».

«БЕЛАРУСЬ» Да 50-годдзя Савецкіх Узброеных Сіл часопіс друкуе пад рубрыкай «З франтавых блакнотаў» вершы К. Кірэенкі, П. Пранузы, П. Прыходзькі. У нумары змешчаны таксама вершы М. Калачынскага, С. Панізніка, Ф. Алеся, Ул. Карызны, М. Федзюковіча, М. Шаховіча.

Часопіс пачынае друкаваць аповесць А. Шашкова «Выбух уначы». Проза прадстаўлена ў часопісе таксама быллю С. Шушкевіча «Воўчыя слёзы», раздзелам з новага рамана славацкага пісьменніка Само Фалцяна, які ў час вайны партызаніў на Беларусі.

Багата публіцыстычных матэрыялаў прысвечана 50-годдзю Савецкіх Узброеных Сіл: пісьмо Маршала Савецкага Саюза С. Цімашэнкі «Са святам, дарагія сябры!», фотарэпартаж М. Паграбняка з воінскіх вучэнняў «Днепр», публікацыя архіўных матэрыялаў аб утварэнні і дзейнасці ў Беларусі першых рэгулярных атрадаў Чырвонай гвардыі, нарыс «Легендарная Іркуцка-Пінская» (пра адно са старэйшых воінскіх злучэнняў, што знаходзіцца зараз на беларускай зямлі), успаміны марака-падводніка М. Ляшкі «Падводны рэйд».

У раздзеле «На кніжнай паліцы» рэцэнзуюцца зборнік «У. І. Ленін у беларускай народнай творчасці», аднатомнік выбраных твораў Я. Купалы «Лірыка», выдадзены на Украіне ў серыі «Жамчужыны сусветнай лірыкі», зборнік артыкулаў Я. Герцовіча «Пісьменнікі, кнігі, героі», кніга І. Навуменкі «Пісьменнікі-дэмакраты», аповесць П. Кавалёва «Падзенне Хвядоса Струка».

«ПОЛЫМЯ» Паэма А. Вярцінскага «Заазер'е», вянок санетаў «Абеліск» Хв. Жычкі, вершы Ю. Голуба, Е. Лось, Р. Тармолы, С. Шушкевіча, М. Стральцова, М. Гелавані складаюць раздзел паэзіі нумара.

У раздзеле прозы — аповесць А. Карпюка «Па кветку шчасця», франтавыя замалёўкі «На вайне як на вайне» Я. Герцовіча, апавяданні В. Адамчыка.

Часопіс друкуе нарыс Я. Зазекі «На сваіх крылах», успаміны Маршала Савецкага Саюза І. Якубоўскага «Пачатак гераічнага шляху» і В. Ласковіча «Мікалай Дворнікаў на Брэстчыне».

У нумары змешчаны артыкулы Ю. Пшыркова, М. Лазарука, Г. Кісялёва (у раздзеле крытыкі і літаратуразнаўства), артыкул Я. Гліндзіч «Праблемы беларускага кіно», рэцэнзіі А. Зарыцкага на «Беларускія народныя казкі» (выдадзена ў Берліне), Я. Семяжона — на зборнік беларускіх казак «Каток — залаты лабок» (славацкае выданне), П. Дзюбайлы — на кнігу С. Гусака «Аляксей Кулакоўскі», П. Пестрака — на зборнік вершаў «Сінія Брады» М. Рудкоўскага..

З артыкуламі па пытаннях культуры мовы выступаюць Р. Клюсаў і Ф. Янкоўскі.

Часопіс друкуе «Старонкі беларускай энцыклапедыі» і «Хроніку».

Яўген ШАБАН
(«Маладосць»)

■ ■ ■

Там дзяўчынка,
як сцяблінка,
як заранка, —
нарачоная мая
нарачанка.
Мне яна яшчэ маленькай
запомнілася,
калі, цішм захапленнем
перапоўненая,
над пэрванаю хусцінкай
чаравала:
вышывала яе,
цыравала...
У тым прызнацца не хацеў я
анікому,
на дзяўчыну ж глядзеў,
як на ікону.

А гады ляцелі чайкамі,
ляцелі...
Ракавінкі пад нагамі
храбусцелі...
Помняць толькі
нарачанскія пярэспы,
як дзяўчына
у сукенцы пярэстай
вечарамі прыбягала
на спатканні
і са мною сустракала
світанні.

Знаюць толькі
хвалі Нарачы і човен,
як мне стала нарачанка
чарачонай.



Мал. К. Ціхановіча да апавядання А. Шашкова «Выбух уначы». («Беларусь»).

«НЕМАН» № 2

Нумар адкрываецца інтэрв'ю з камандуючым войскамі Беларускай ваеннай акругі Героем Савецкага Саюза генерал-палкоўнікам І. М. Трацьяком.

Часопіс працягвае друкаваць раман М. Кругавых «Добры дзень, таварышы маеі!..» У часопісе таксама змешчаны апавяданне Івана Мялы «Мы табе верым» (з апавяданняў пра Ю. Алешу); аповесць Уладзіміра Караткевіча «Ладдзя роспачы» (пераклад В. Сёмухі).

Паэзія прадстаўлена вершамі П. Прыходзькі (пераклады Н. Кісліка і Ул. Прыходзькі), С. Шушкевіча (пераклад В. Тараса), А. Данільчанкі і Г. Шутэнкі.

Аб працы Рэчыцкай геаграфічнай экспедыцыі расказвае тэхнік-аператар М. Чырык.

У раздзеле «Публіцыстыка» — артыкул кааператара Веры Верыгор.

Часопіс друкуе ўспаміны чэкіста Героя Савецкага Саюза М. Мікайлашава аб падпольшчыках Гомельшчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

З артыкулам аб творчасці Пімена Панчанкі выступае Р. Бярозкін.

Кастусь КІРЭЕНКА
(«Беларусь»)

З ФРАНТАВЫХ БЛАКНОТАЎ

■ ■ ■

Хай мне шырокае поле даруе,
Калі багаццем не поўна яно,
Калі не радасна жыта красуе,
Калі не буйнае ў жыта зярно.
Роднае поле! Як люба ты сэрцу —
Ведае добра прастор залаты.
Вер мне: не здолею нават
памерці,
Покуль стаптана чужынцамі ты.

Хай мне даруюць куўшынкі
І дрэвы,
Каля азёр маіх — пушчы-пясы,
Што ад грымот не ўбярог іх
напеваў,
Што ад агня не ўбярог іх красы.
Мілая вёска, разлогаў кілімы,
Сцежкі, і рэчка, і дуб на браду!
Верце: без вас мне жыццё
немагчыма,
Вось чаму сёння на бой я іду.

1944.

Уладзімір ПАЎЛАЎ
(«Маладосць»)

ЛЯ ВАЕННЫХ ПЕРАПРАЎ

Гулі самалёты, як восы,
Над ніткамі дзвюх перапраў.
А воддаль, галодны і босы,
Стары на пагорку араў.

Адна пераправа — у пекла,
Другая—вяртала у рай.
Тут рота сапёрная ссекла
На палі бярозавы гай.

Жыўцом хоць кладзіся, хоць
трэсні,
А дай пераправу у час!
Бярвенне раскідваў, як трэскі,
Пры кожным налёце фугас.

Гулі самалёты, як восы,
Над ніткамі дзвюх перапраў.
Стары, згаладалы і босы,
Каняку ў сапёраў узяў.

Пакуль тыя пілы вастрылі,
Кацілі к вадзе круглякі,
Старога нямоглыя сілы
За плугам хісталі ў бакі.

А бомбы ляцелі у жыта,
У пойму, на ўзмежак пясны.
Са злосці сцвярвятнік падбіты
Па дзеду тады паласнуў.

Пакуль не спынілі гнядога,—
Палёгку адчуў балазе,—
Цягнуў ён за лейцы старога
Па цёплай яшчэ баразне.

Бамбёжкай ні палі не ссекла, —
Сапёрная рота, спявай!
Адна пераправа — у пекла,
Другая — таксама не ў рай.

Мечыслаў ШАХОВІЧ
(«Беларусь»)

РАЗМОВА З ПЕЦЕМ КЛЫПАМ

Мо паўкрока ад жыцця да
смерці,
Цішыня развесіла тугу...
Не хвалюйся, юны дружа
Пеця,
Чуеш, я табе дапамагу.
Акажу я воінам паслугу,
Дай мне толькі ў рукі
кацялок,
Зачарпну вады халоднай
з Буга —
Будзе кожнаму, ну хоць адзін
глыток.
Як вады чакаюць абаронцы!
Асцярожна, Пеця, не разлі.
Беражы ваду, як кроплю
сонца,
Каб жыццё не згасла на зямлі!

Мал. А. Кашкурэвіча да апавядання Анатоля Сідарэвіча «Сцішанасць». («Маладосць»).

Якаў Герцовіч

НА ВАЙНЕ ЯК НА ВАЙНЕ

З ФРАНТАВОГА БЛАКНОТА

АПОШНЯЯ ВАХТА

Меркавалася, што ноччу наша рэдакцыя атрымае неабходны транспарт і выедзе з Мінска, бо выпускаць тут франтавую газету мы болей не маглі: усё навокал гарэла, плавілася, трашчала.

Намеснік рэдактара маёр Мікалай Баканаў нікога не выпускаў з падвала. Толькі двум навабранцам, мне і Сяргею Жураўлёву, ён дазволіў рызыкнуць, бо мы вельмі прасіліся: трэба ж было даведацца, што сталася з нашымі сем'ямі, пакуль нас экіпіравалі, узбройвалі чым папала, знаёмілі цывільных газетчыкаў з абавязкамі ваенных журналістаў.

Дзве гадзіны і ні мінуты болей, маглі мы хадзіць з падвала ў падвал, гукаць сваіх, пытацца ў людзей, дзе яшчэ ёсць жывыя душы, якія ўратаваліся і хаваюцца ад новых налётаў варожай авіяцыі. Вярталіся мы збянтэжаныя, збітыя з панталыку. Хатка ля самай ракі, дзе мы з Сяргеем жылі ў добрым суседстве, была пасечана асколкамі і магла вось-вось загарэцца, бо побач бушавала полымя. Дагараў нядаўна яшчэ шумны дом, куды мая сем'я магла перабрацца ў пошуках прыстанку. Ледзь не палавіну квартала загрувасцілі руіны школьнай камяніцы, у падвале якой яшчэ напярэдадні бачыў я многа знаёмых і блізкіх людзей. Ва ўсім гэтым раёне адзінока стаяў горды і жывучы гмах опернага тэатра. Мы — туды, у падвал, да людзей, якіх тут назбіралася вельмі многа. Не, і тут няма нашых жонак, дзяцей.

Пакуль мы абмацвалі вачыма кожны куток падвала, над горадам зноў закружыліся фашысцкія бамбавозы. Некалькі бомб упала паблізу. Адседжвацца мы не маглі, бо ўжо добра ведалі, што маёр Баканаў не даруе за спазненне. Выбіраемся наверх і не верым вачам: ля ўваходу ў тэатр спакойна стаіць пажарнік у касцы. Ён не пакідаў свае вахты і тады, калі тут, нібы ў апошні дзень Пампеі, само неба валілася на зямлю. Пытаемся, ці даўно нясе ён сваю вахту. Даўно! З самае раніцы. А не зменяць — прыйдзецца стаяць і стаяць, бо як гэта можна, каб тэатр застаўся без пажарніка?

Многа бачыў я потым адвагі і баязлівасці, геройства і панічнага, жывёльнага страху. І заўжды ўспаміналася мне пры гэтым адзінокая постаць пажарніка, якога толькі смерць магла вызваліць ад вахты.

СНАЙПЕРСКІ РАХУНАК

Са снайперам Гуляевым цяжка было гаварыць без перакладчыка, бо ведаў ён толькі з дзесятак самых неабходных рускіх слоў. Добра, што камандзір роты ведаў прыблізна столькі ж слоў якуцкіх. Вось мы ўдвух і цягнем за язык Гуляева, а ён гаварыць не хоча, адмоўчваецца. Скуласты твар яго наліваецца чырванню, калі камандзір сарамаціць яго за непавагу да повара:

— Той стараўся, некалькі разоў падаграваў вячэру, чакаючы твайго звароту з позняй снайперскай вахты, а ты што робіш? Галадоўку абвяшчаеш, на таварышаў не глядзіш! Скажы, што з табою здарылася ў засадзе?

Так-сяк разабраліся мы, што ў Гуляева і сапраўды была ў засадзе вялікая непрыемнасць: у поле яго зроку за дзень трапілі тры немцы. Ён іх забіў. Але страляў не тройчы, а чатыры разы. Хіба ж можа сабе дараваць праслаўлены на ўсю Якуцію паляўнічы, што адзін раз прамахнуўся? А калі пра гэта даведаюцца бацька, сваякі, таварышы? Умеў Гуляеў пацэліць вавёрцы ў самае вока, а пайшоў на фронт — і стрэліў міма, ледзь не выпусціў буйнага звера...

Супакоіўся салдат толькі тады, калі камандзір роты сказаў, што для такога звера, як фашыст, і дзвюх куль не шкада. Але ён усё роўна прасіў нас не пісаць пакуль-што бацьку пра яго першы промах.

САЛДАЦКІЯ СНЫ

Салдат Анатоль Поснікаў забіў гітлераўца і болей пра гэта не думаў: звычайная справа. І той жа Анатоль гаварыў мне, што вельмі перажываў, калі па абавязку салдата змушаны быў ссячы клён.

— Разумееце, таварыш маёр, раней тут стаяла прасторная хата вокнамі на вуліцу. Клён глядзеўся ў адно з вокнаў і, зразумела, быў часткай прыгожай і радаснай карціны. Некалі ж вернецца гаспадар і на родным папялішчы пабудуе новы дом. На гэта яму спатрэбяцца месяцы. А каб вырасціць такі ж, як і раней, клён — спатрэбяцца гады.

Размову нашу слухаў і салдат Аляксандр Гардзееў. Яго таксама хвалявала гэтая тэма.

— Бачыце, — гаварыў Аляксандр, — салдат на вайне лішняга слова не скажа, а думае ён пра ўсё. І многае адкладваецца ў сэрцы. Ніколі не забуду пра адну вызваленую намі вёску. Ні адной цэлай хаты... І людзей нідзе няма. А дзесьці ў руінах сядзіць галодны певень. На досвітку ён кукарэкае, падымае людзей на работу. А людзей, разумееце, няма...

Аляксандра Гардзеева некуды паклікалі. Тады Анатоль Поснікаў загаварыў ахвотней:

— Заўважце, пра адзінокага пеўня гэты салдат вам сказаў. А пра тое, што фашысты забілі яго жонку і сына, ведаю толькі я. Ды і са мною ён гаварыў пра гэта толькі ў той дзень, калі атрымаў пісьмо ад землякоў.

Я маўчу, але ўсё разумею. Гора сваё салдаты не выстаўляюць напаказ. Аднойчы, недзе пад Валакаламскам, мы вызвалілі вёсачку. Анатоль убачыў на вуліцы дзяцей, заколатых штыкамі, і пасля не спаў многа начэй, не мог смяяцца, жартаваць — перад вачыма была ўсё тая ж карціна: трупы дзяцей, кроплі засохлай крыві на снезе... Паганыя фашысты здзекаваліся з нашых дзяўчат, нашых бацькоў. Гэтага дараваць нельга. Ён і ваюе моўчкі, да болю сцяўшы зубы. Сёння ён нешта разгаварыўся. Значыць, і тое кукарэканне ў руінах сніцца яму па начах, як і мне — той ссечаны клён...

А што сніцца мне трывожнымі начамі? Паспрабуй успомніць усе сны, ад якіх разломваецца галава...

ПАКРЫЎДЖАНЫ КЛЯЙНБАЎЭР

Усходняя Прусія. На полі побач з цукровымі буракамі — жалезабетонныя каўпакі, сярод сціртаў нязвезенага збожжа — груды абясшкоджаных нашымі сапёрамі мін. У масіўных, падобных на казармы дамах — байніцы. Побач з акопамі першай сусветнай вайны — свежыя ўмацаванні, зробленыя зусім нядаўна.

Мой напарнік маёр Рыгор Улаеў, чалавек назіральны і вельмі цікаўны, раіць агледзець ферму на ўскраіне вёскі Бартцкемен. Не разумею, чым яго прывабілі жоўты прыземісты дом, гаспадарчыя службы, каменная агарожа. Хіба мала бачылі мы такіх ферм? Падыходзім, глядзім: на глухой сцяне, што выходзіць у сад, на цаглінах добра прыкметны рускія літары: «Тут пакутавалі палонныя рускія салдаты лейб-гвардыі грэнадзёрскага палка, 40 чалавек. Гэтае гняздо трэба зруйнаваць. 1916 год». І ніжэй, але ўжо іншай рукой, выбіты словы: «Мы — таксама. 1941—1942».

Заходзім у суседні пусты дом, дзе, відаць, жыла небагатая сям'я. У шафе акуратнымі радочкамі выстаўлены парожнія бляшанкі з-пад кансерваў. На бляшанках напісана: «Нідэрланды». Сынок, мусіць, рабаваў Галандыю і пасылаў бацькам падарункі.

Яшчэ адна вёска. Тут нам удаецца пагаварыць з пажылым немцам, які называе сябе кляйнбаўэрам, бедняком. Ота Флішман кажа, што яго крыўдзілі і пры кайзеры і пры Гітлеры. Ну, думаем, мабыць, у гэтага беднякa захаваліся нейкія рэшткі класавых пачуццяў. Мерус запісаць споведзь беднага чалавека.

Далікатна прашу, каб Флішман сказаў, хто яго крыўдзіў, калі. Мяне скаланула, калі я пачуў спакойны адказ:

— Вось і нядаўна пакрыўдзілі. Усім баўэрам далі па некалькі рускіх нявольніц, а мне — ні адной.

Маёр Улаеў ажно плюнуў.

ДАЛЕКАЕ І БЛІЗКАЕ

У пакінутым гаспадарамі доме спявае цвыркун. Прывычная, сотні разоў чутая песня: аб пірагах, удала спечаных гаспадыняй, аб салодкім паху малака, што цэдзіцца з дайніцы, аб утульнасці абжытай кватэры. Запечны спявак не сціхае.

Салдат Малыгін не можа спакойна слухаць:

— Нават цвыркуны навучыліся ў Геебельса брахаць. Гаспадар загінуў на фронце, гаспадыня туліцца недзе ў лесе ці блукае па разбітых дарогах, а гэты дурань спявае пра ўтульнасць, дабрабыт.

А цвыркун усё ж спяваў. І міжвольна думалася аб далёкім доме, аб родных і блізкіх, прыгадвалася самае дарагое, запаветнае, сваё, тое, пра што не скажаш і лепшаму сябру. Малыгін выцягнуў з бакавой кішэні фотакартку, паглядзеў адзін раз, паглядзеў другі раз, усміхнуўся сваім думкам і адвярнуўся ад таварышаў. Я падсеў да яго, пазнаёміўся, і мы разгаварыліся. Малыгін паказаў мне фатаграфію, з якой глядзела дружная і слаўная сям'я: сам гаспадар, у цывільным гарнітуры і пры гальштуку. Жонка пазірае на двух сваіх хлопчыкаў, і з вачэй маладой жанчыны выпраменьваецца ціхая радасць.

Падышоў яфрэйтар Салтыкоў і паказаў фатаграфію свайго сына.

Мой калега, карэспандэнт армейскай газеты, у сваю чаргу працягнуў Салтыкову фатаграфію маленькай дзяўчынкі:

— А гэта мая дачка.

Я ведаў, што дачка майго калегі загінула ад нямецкай бомбы яшчэ ў пачатку вайны. Прызнаюся: вельмі не хацелася, каб ён загаварыў пра гэта. Гаворка аб крыві і смерці не пасавала б агульнаму настрою. Гляджу на яфрэйтара Салтыкова, які трымае ў руках дзве карткі: хлопчыка, што недзе жыве, дзяўчынкі, якая загінула. З абедзвюх фатаграфій усміхаюцца вясёлыя вачаняты. Яфрэйтар гаворыць майму таварышу:

— Мы з вамі можам стаць сватамі, глядзіце, якая цудоўная парачка.

Мой таварыш пачырванеў, але нічога не сказаў.

Гаворка стала агульная. Малыгін паказаў пісьмо ад сына. Хлопчык піша: «Татуля, я ўжо не маленькі, а ты ў пісьмах называеш мяне то карапузам, то карацелькай. Які ж я карапуз, калі маю сто працадзён і сам старшыня лічыць мяне найпершым памочнікам».

Усе паглядзелі на фатаграфію. Хлопчык быў ніштаваты, але ўзрост... Не верылася, што гэтыя маленькія рукі спраўляюцца з цяжкай працай на ферме. Малыгін даводзіў, што ўся парода ў яго такая — моцная, працавітая. Салтыкоў адказаў на гэта, што і з яго сына вырасце яшчэ адзін Паддубны.

Халасцякі слухалі, але пра сябе гаварылі мала. Лягчэй расказаць пра жонку, чым пра каханую дзяўчыну пасля двух-трох гадоў разлукі. Не заўсёды скажаш пра першы пацалунак, першую клятву. І слоў не падбярэш, і сціплaсць замінае. А многія ведалі «сваіх» дзяўчат толькі па пісьмах, фатаграфіях: завочнае каханне таксама мела свой сэнс у франтавых умовах... Хто яго ведае, мабыць, не адно шчаслівае вяселле будзе згуляна пасля вайны, калі пісьмы прывядуць да асабістага знаёмства.

Салдата Ларына таварышы ўжо цяпер называюць жаніхом. Сам ён пра сваю дзяўчыну нічога не гаворыць. Расказваюць яго сябры. Дзяўчыну завуць Марусяй, жыве яна на Урале. Па фатаграфіі з ёю знаёма ўся рота. Толькі ўчора паштальён яшчэ здалёку крычаў Ларыну:

— Коля, танцуй, табе пісьмо ад каханай!

Учора ж атрымаў пісьмо і жаніх-завочнік Калашнікаў. Гэты гаворыць пра сваю дзяўчыну з усмешкай: «Дзівачка, у яе ў галаве яшчэ вецер гуляе... Піша, каб я не затрымліваўся і хутчэй прыязджаў, бо няма з кім... танцаваць».

Далёка за намі засталася родная зямля. Колькі яшчэ трэба дзён і начэй, каб вярнуцца да жонак, дзяцей, бацькоў, нявест! І хто загадзя ведае, што менавіта ён дачакаецца перамогі, вернецца, калі наперадзе яшчэ столькі баёў... Але жывому трэба думаць пра жывое, інакш ты не салдат.

Гэты нарыс некаму нагадаў, што і я, мусіць, жывы чалавек. Нейкая дзяўчына з санбата прыслала пісьмо, што хацела б пазнаёміцца з карэспандэнтам, які, мяркуючы па нарысе, верыць у завочнае каханне.

ЛІСТОЎКА

З рук у рукі хадзіла лістоўка: «Вучыцеся ў разведчыка-камсамольца Велікжаніна ненавідзець і знішчаць ворага». Лістоўка была кароткая, а мне хацелася ведаць дэталі, узнавіць абставіны. Разведчыкі ахвотна расказалі пра свайго таварыша.

Пачалося ўсё проста і звычайна. Камандзіру цяжка было кіраваць боем, пакуль ён не ведаў дакладна, што робіцца на ўскраі хвойнага лесу, дзе заўважаўся нейкі рух праціўніка. У такіх выпадках у разведку пасылаюць самых бывалых і кемлівых салдат. Выбар паў на Велікжаніна і двух яго таварышаў.

Перад лесам была траншэя, па ўсіх прыкметах — зусім нядаўна пакінутая немцамі. Навошта яны гэта зрабілі? І чаму так ціха ў лесе, калі вядома, што там акапалася многа гітлераўцаў? Былі і іншыя пытанні. Велікжанін і яго таварышы пільна назіралі і неўзабаве ўсё зразумелі. У лесе яны заўважылі некалькі старанна замаскаваных танкаў. Ужо адно гэта адкрыццё мела важнае значэнне для камандзіра.

Потым высветлілася, што і траншэя не зусім пакінутая: у нішах захаваны боепрыпасы, часам сюды наведваліся нямецкія салдаты. Можна было здагадацца, што праціўнік чакаў нашага наступлення і адвёў сваіх салдат з траншэі толькі на той час, пакуль савецкая артылерыя будзе апрацоўваць пярэдні край. Потым гітлераўцы вернуцца і сустрэнуць атаку нашай пяхоты знішчальным агнём. У разгар бою нямецкія танкі выйдуць з лясной засады і рынуцца на наш правы фланг. З такімі звесткамі трэба было хутчэй спяшацца да камандзіра, і разведчыкі рушылі ў свой полк.

Немцы заўважылі салдат і адкрылі агонь. Велікжаніна параніла ў плячо, потым у нагу. Быў ён старшым у групе, і таварышы чакалі яго слова. А сказаў ён так: калі разведчыкі панясуць яго на руках, усім тром не выбрацца. Тады камандзір не даведаецца пра падрыхтаваную немцамі пастку, і полк панясе вялікія страты. Таму ён, Велікжанін, застаецца на месцы і сам будзе адбівацца ад ворага, а два разведчыкі няхай вяртаюцца ў полк. Хлопцы пярэчылі, але Велікжанін яшчэ раз загадаў ім ісці.

Паранены і знясілены салдат прыкрываў агнём адыход сваіх таварышаў. А немцы падпаўзалі ўсё бліжэй. Уратавацца ўжо нельга было. Тады салдат прыкінуўся мёртвым. Немцы падышлі ўпрытык. Яны піхалі Велікжаніна каванымі ботамі, шнырылі ў яго ў кішэнях. Салдат не варушыўся, не стагнаў. Тады немцы паднялі разведчыка і выкінулі яго з траншэі.

Гадзіны дзве праляжаў разведчык на відавоку ў немцаў. Аднекуль падышлі яшчэ тры гітлераўцы. Адзін з іх ударыў нерухомага салдата прыкладам. Велікжанін застагнаў. І тады пачалося... Разведчыка білі прыкладамі, калолі штыкамі, на ім танцавалі. Велікжанін не ведае, колькі часу яго катавалі, ён быў непрытомны. Немцы нацешыліся ўволю і пайшлі, бо думалі, што цяпер салдат напэўна мёртвы.

Разведчык быў жывы. Апрытомнеўшы, ён дачакаўся ночы і папоўз. Раніцай, калі нашы пайшлі ў атаку, Велікжаніна знайшлі за 25 метраў ад варожай траншэі. Дактары сказалі: калі ёсць на свеце цуды — то гэта адзін з іх. Салдат, на целе якога не засталося жывога месца, ачуняў у шпіталі і выжыў. З палітаддзельскай лістоўкі пра гэта даведалася ўся дывізія.

Анатоль ВЯРЦІНСКІ
(«Полымя»)

З ПАЭМЫ «ЗААЗЕР'Е»

Ад вёскі да могілак —
паўвярсты.
Ад вёскі да могілак —
доўгія вёрсты.
Ад вёскі да могілак —
шлях няпросты.
Гараць за спіною тваёю масты.
Не вернецца маці.
Не прыйдзеш ты
да маці. Між вамі
чарнее бяздонне.
Астыне роднае ваша гняздоўе...
Ад вёскі да могілак —
паўвярсты.
Ад вёскі да могілак —
шлях далёкі,
доўгія вёрсты,
трудныя крокі.
Як ты паспееш да цемнаты!
Цябе паганяе звычай стары.
Трэба паспець да заходу сонца.
А шлях гэты цягнецца бясконца.
І ты ўсё ідзеш.
Ад зары да зары.
І ты ўсё глытаеш
той горкі камяк,
і ты ўсё глытаеш
камяк той салёны,
і ты ўсё ідзеш
за тымі санямі.
Днямі ідзеш.
І не дойдзеш ніяк.
Ідзеш і не знаеш,
ці дойдзеш ты.
Чапляюцца ногі.
Губляюцца крокі.
Ад вёскі да могілак —
шлях далёкі.
Ад вёскі да могілак —
паўвярсты.

Міхась КАЛАЧЫНСКІ
(«Беларусь»)

ПАРАД У МАІМ ГАРАДКУ

Парад у гады дваццатыя
На вуліцы ў цэнтры раённым.
Без войска,
хоць шлемы чубатыя
На большасці — як на Будзённым.
Галоўная сіла —
пажарнікі,
Іх каскі надраены гэтак,
Нібы рэвалюцыі жар які
Нясуць,
каб раздзьмуць над светам.
Следам —
да зброі прывычныя,
Знаёмыя з дзён партызанскіх
Раёну ўсяго паляўнічыя,
На куртках —
з агню павязкі.
За імі —
уся міліцыя
(Наганы пры боку ў многіх),
А потым —
без амуніцыі
Мы,
гвардыя басаногіх.
Наперадзе ўсіх страшыдлішча —
З рыз Чэмберлен у цыліндры,
Вачышчы па яблыку вытрашчыў
На нас,
капіталава гідра.
Сілы пратупалі ўдарныя
На пляц —
мнагалюддзя арэну,
І ружжы над святам ударылі
Па брухачу Чэмберлену,
Пан Чэмберлен рассыпаўся —
Вецер шматкі разносіць...
Глядзі, капітал,
не рыпайся!
З вайной выступаць пабойся!
Парад прадаўжаўся на вуліцах
І ў колішнім панскім садзе.
Рамантыка рэвалюцыі
На тым выступала парадзе.

Паўлюк ПРАНУЗА
(«Беларусь»)

СНОП АЎСА

Замаскаваны добра голлем,
Стаю, разведчык я, ў лязе.
З узгорка, дзе пачатак поля,
У лагчыну сноп аўса паўзе.

Я на пасту. Перада мною
Прасторы родныя ляжаць.
Я вырашыў: любой цаною
У палон жыўцом той «сноп»
узяць.

І набрыняла сэрца злосцю.
Бяру вінтоўку я ў руку.
Сюды змаглі патрапіць госці,
Адсюль — дарога на замку.

Без літасці крывавых гадаў
Частуем — хопіць ім свінца.
Мапанкава сваім прыкладам
Абмапацію я «сноп аўса»...

1941.
Бранскі фронт.

НА ЭКРАНАХ РЭСПУБЛІКІ

«ТВОЙ СУЧАСНІК»

«Мы жывём у складаны час, зараз кожны чалавек павінен добра ўяўляць сабе — хто ты, уласна, ёсць? З кім ты? Аб чым думаеш, калі сядзіш адзін? Адзін сам-насам?» Вось аб чым гэты фільм, герой якога Губанаў — сын (арт. І. Уладзіміраў), а яго бацьку у свой час таленавіта сыграў нябожчык Яўгеній Урбанскі ў фільме «Камуніст».

Фільм «Твой сучаснік» зняты на студыі «Масфільм», аўтарам сцэнарыя Я. Габрыловіч і Ю. Райзман. Рэжысёр Ю. Райзман. Аператар Н. Ардашнікаў.

«АННА КАРЭНІНА»

Многія майстры сусветнага экрана і сцэны ўжо спрабавалі стварыць вобраз Анны. У гэтай ролі ў тэатры выступалі Ала Тарасава, у кіно — Грэта Гарбо, Аста Нільсан, Віўен Лі. І вось цяпер з гераіняй Талстога гледачы сустрэнуцца ў новай каляровай двухсерыйнай шырокафарматнай карціне «Анна Карэніна», створанай рэжысёрам Аляксандрам Зархі на кінастудыі «Масфільм». У ролі Анны — артыстка Таццяна Самойлава.

«Я ВАС ЛЮБІЎ»...

Вось што расказвае аб сваім фільме рэжысёр-пастаноўшчык Ілья Фрэз.

— Героі нашай карціны—звычайныя хлапчукі ў тым самым узросце, калі ўласныя ногі і рукі здаюцца празмерна доўгімі, калі ламаюцца галасы і характары, калі за грубым словам і развязным тонам тоіцца чулае сэрца і дабрата...

Асноўнае пытанне, якое мы ставілі ў карціне не «кім быць?», а «якім быць?».

У галоўных ролях здымаліся Віктар Перавалаў, Віялета Хуснулава, Віталій Аванесаў і іншыя артысты.

У гэтым месяцы гледачы маюць магчымасць пазнаёміцца таксама з радам іншых карцін: савецка-мангольскай — «Зыход», беларускай — «Усходні калідор», кіргізскай—«Неба нашага дзяцінства», таджыкскай — «Пад попелам агонь», студыі імя Даўжэнкі — «Усюды ёсць неба», чэхаславацкай — «Раманс для карнета», венгерскай — «Бацька», арабскай — «Выгнаны з раю» і іншымі.

НАШ ЧЭШСКІ ДРУГ

ДА 90-годдзя З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЗДЭНЕКА НЯЕДЛЫ

ЗАЎТРА спаўняецца 90 гадоў з дня нараджэння выдатнага чэшскага вучонага, заснавальніка і першага прэзідэнта Чэхаславацкай Акадэміі навук, акадэміка Здэнека Няедлы.

Усё яго жыццё, уся багатая і рознабаковая творчасць—у галіне гісторыі, публіцыстыкі, літаратуры і музыказнаўства—былі прысвечаны вялікай справе вызвалення свайго народа і будаўніцтву новай, сацыялістычнай культуры.

З асабліва цёплым пачуццём успамінаем мы кіпучую дзейнасць Здэнека Няедлы, накіраваную на развіццё і ўмацаванне дружбы народаў Чэхаславакіі і СССР,—Няедлы быў ініцыятарам стварэння «Таварыства культурнай і эканамічнай сувязі з новай Расіяй» і яго нязменным старшынёй. Здэнек Няедлы адным з першых указаў на велізарнае значэнне дружбы з Савецкім Саюзам для будучыні чэхаславацкага народа і нястомна прапагандаваў дасягненні нашай эканомікі і культуры, у тым ліку і поспехі маладой Беларускай Сацыялістычнай Рэспублікі.

У сваім часопісе «Вар» Зд. Няедлы адзначыў, што беларусы «ў сваёй самастойнай рэспубліцы за некалькі год развіліся так, як можа развіцца народ—вядома, з добрым карэннем—толькі ў атмасферы новай, цёплай і свежай вясны. І яны сёння маюць ужо не толькі свой дзяржаўны лад, але і свае культурныя ўстановы, свой універсітэт, сваю літаратуру, якая пасляхова развіваецца з часоў першай рэвалюцыі 1905 г.».

Беларуская літаратура вабіла Зд. Няедлы сваёй народнасцю. Наогул, яго любімымі пісьменнікамі заўсёды былі тыя, хто з павагай пісаў пра жыццё працоўнага народа, хто высвятляў простым людзям іх горкі лёс у грамадстве эксплуатацыі і прыгнёту, хто заклікаў народ на барацьбу за свае правы. Таму чэшскаму вучонаму сталі блізкімі творы Я. Купалы, Я. Коласа, Ц. Гартнага.

Зд. Няедлы выступаў з дакладамі аб творчасці гэтых пісьменнікаў на вечарах, арганізаваных у Празе філіялам «Маладняка» і «Таварыствам культурнай і эканамічнай сувязі з новай Расіяй». Ён добра ведаў нашу музыку і прысвяціў ёй адно з сваіх выступленняў у канцэртнай зале «Умелецке беседы», у якім, па сведчанню слухачоў, «яркімі фарбамі намаляваў выразны, да падрабязнасцей, вобраз беларускай песні, умовы яе развіцця і сучасны стан. Ён характарызаваў беларускія песні па жанрах—абрадавыя, сямейныя, любоўныя, жартоўныя, танцавальныя».

Цікава, што ў час канцэрта Здэнек Няедлы сам акампаніраваў (і па прызнанню прысутных—дасканала) выканаўцы беларускіх народных песень.

У лістападзе 1927 года Зд. Няедлы наведаў Беларусь. Яго тут цікавіла ўсё—бібліятэкі, музеі, школы, рабфакі, універсітэт, Інстытут беларускай культуры, тэатр.

«Куды б вы ні пайшлі,—пісаў ён потым,—вы ўсюды знойдзеце мастацтва на такім высокім узроўні, аб якім нам тут і не сніцца. Я бачыў гэта і ў Беларускім дзяржаўным тэатры ў Мінску, дзе прагледзеў п'есу, якую і ў нас і за мяжой бачыў, можа, на дваццаці сцэнах,—«Сон у летнюю ноч». Але толькі тут, у Мінску, я бачыў яе ў дасканалым выкананні».

Вярнуўшыся ў Чэхаславакію, Зд. Няедлы выступіў з шэрагам дакладаў і артыкулаў аб выдатных дасягненнях Савецкага Саюза і, у прыватнасці, Беларусі. «У самастойнай, свабоднай Беларускай рэспубліцы,—пісаў ён у артыкуле «Беларусь»,—беларускі народ дасягнуў вялікага прагрэсу—абудзіўся ў культурных адносінах, арганізаваўся ў эканамічных, стаў самастойным палітычна карацей кажучы, стаў жывой нацыяй».

Калі на чэхаславацкую, а затым на нашу зямлю прыйшла вайна, Зд. Няедлы разгарнуў ва Усеславянскім камітэце актыўную дзейнасць па згуртаванню славянскіх народаў супраць фашысцкай навалы.

Разам з намі ён смуткаваў у часы няўдач і радаваўся ў дні перамог. «Тры гады з глыбокім смуткам глядзелі мы на блізкую нам Беларусь, якую таптaлі гітлераўскія звяры, — пісаў наш чэшскі друг у дзень вызвалення Мінска.— —Тры гады таптаў Гітлер вашу зямлю, вашу радзіму. Але і на беларускія вуліцы прыйшло свята. Прыйшоў канец рабства, канец пакут!».

Пасля вызвалення Чэхаславакіі Зд. Няедлы стаў актыўным будаўніком новага, сацыялістычнага ладу. Ён займае пасаду міністра ў чэхаславацкім урадзе, а ў 1952 годзе ўзначальвае Чэхаславацкую акадэмію навук. Выходзіць збор твораў вучонага ў 35 тамах.

Сэрца Здэнека Няедлы—сэрца палымянага патрыёта сваёй краіны, мужнага, праўдалюбівага чалавека—да апошняй хвіліны білася ў адным рытме з жыццём яго народа, яго радзімы.

А. МАЖЭЙКА.

ПАЭТ, ДРАМАТУРГ, ЗМАГАР

ДА 70-годдзя З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ БЕРТАЛЬДА БРЭХТА

У ЦЭНТРЫ сталіцы ГДР, побач з магістральнай вуліцай Фрыдрыхштрасэ, на беразе канала стаіць вялікі будынак заснаванага ў 1949 годзе тэатра «Берлінер ансамбль ам Шыфбаўэрдам». Характар і кірунак гэтага тэатра, бадай, вельмі ўдала адлюстраваны ў яго эмблеме — твары людзей рознага колеру скуры вакол белага голуба (малюнак П. Пікасо), што сімвалізуе адзінства рас і народаў у барацьбе за мір. Заснавальнікам і мастацкім кіраўніком гэтага тэатра з'явіўся выдатны нямецкі пісьменнік і драматург Бертальд Брэхт (1898—1956).

Пачатак літаратурнай дзейнасці Брэхта адносіцца яшчэ да першай сусветнай вайны, калі ён служыў санітарам у ваенным шпіталі ў родным горадзе Аўгсбургу. Ужо тады малады Бертальд становіцца актыўным праціўнікам вайны. У 1918 годзе ён піша баладу «Легенда пра мёртвага салдата», у якой са з'едлівым сарказмам выкрывае кайзераўскую імперыю, асуджаную на немінучую пагібель. Нянавісць да імперыялістычнай вайны гучыць у напісаных ім у 20-я гады драмах «Барабаны ўначы» і «Чалавек ёсць чалавек». У гэтыя гады Брэхт збліжаецца з Кампартыяй Германіі, вядзе шырокую прапагандысцкую работу. У 1932 годзе ён стварае сцэнічную апрацоўку рамана М. Горкага «Маці»—яркую п'есу, якую Брэхт пазней не толькі паказваў у «сваім» тэатры, але і ставіў за рубяжом.

Пасля прыходу Гітлера да ўлады Брэхт вымушаны пакінуць Германію і доўгія гады жыць у эміграцыі ў розных краінах. Фашысты пазбавілі Брэхта германскага грамадзянства. На берлінскай плошчы Опер-плац 10 мая 1933 года яны публічна спалілі яго творы. Але ўсё гэта не зламала мужнага пісьменніка і змагара. У эміграцыі ён стварае свае найбольш значныя творы, прасякнутыя пратэстам супраць вайны. Яны здабылі яму сусветную вядомасць.

Сумесна з Фейхтвангерам і Г. Манам Брэхт апублікаваў зварот да германскага народа з заклікам звергнуць Гітлера і спыніць злачынную вайну супраць міралюбівых народаў...

У Германію Брэхт здолеў вярнуцца толькі пасля разгрому гітлераўскага фашызму. І ён адразу ж уключыўся ў барацьбу працоўных ГДР за шчаслівую будучыню для ўсяго нямецкага народа. Брэхт—член Сусветнага Савета Міру, правадзейны член Нямецкай акадэміі мастацтваў (ГДР) і член праўлення Саюза пісьменнікаў маладой рабоча-сялянскай рэспублікі.

На сцэне тэатра Брэхта, як сталі ў ГДР называць тэатр «Берлінер ансамбль», з велізарным поспехам ішлі і ідуць яго п'есы «Матуля Кураж і яе дзеці», «Жыццё Галілея», «Каўказскі мелавы пояс», «Трохгрошавая опера». Яркае, незабыўнае ўражанне застаецца ад прагляду спектакля «ў арыгінале», г. зн. на той самай сцэне, дзе ўсё пастаўлена самім Брэхтам, ды яшчэ ў выкананні такіх выдатных акцёраў, як Гелена Вейгель-Брэхт (жонка пісьменніка, якая пасля яго смерці стала мастацкім кіраўніком тэатра) і Эрнст Буш, добра вядомы савецкім людзям па выкананню нямецкіх рэвалюцыйных песень, а таксама раду маладых таленавітых артыстаў — выхаванцаў тэатра. Гэтыя спектаклі тэатр Брэхта з нязменным поспехам паказваў у час сваіх зарубежных гастроляў, у прыватнасці, у Маскве і Парыжы, Празе і Лондане, Варшаве і Вене.

Прымаючы з рук Мікалая Ціханава Міжнародную Ленінскую прэмію «За ўмацаванне міру паміж народамі», Бертальд Брэхт сказаў: «Што б ім ні ўнушалі, народы ведаюць: мір — гэта альфа і амега, жыццёвая аснова ўсякай дзейнасці, накіраванай на карысць чалавецтва, усякай творчасці, усіх мастацтваў, у тым ліку і мастацтва жыць». У гэтых словах сфармулявана, бадай, асноўная ідэя ўсёй яго творчасці, усёй яго грамадскай дзейнасці.

Да 70-годдзя з дня нараджэння Брэхта выдавецтва ГДР «Аўфбаўферлаг» падрыхтавала выданне двух новых тамоў (13 і 14) збору твораў драматурга. У іх увайшлі аднаактовыя п'есы, напісаныя ў 1919 годзе, а таксама «Турандот» —апошні твор, над якім працаваў пісьменнік. Акрамя таго, выпускаецца ў свет двухтомнік артыкулаў і пісьмаў Брэхта, якія ўяўляюць сабой сістэматызаванае выкладанне поглядаў драматурга па палітычных і ідэалагічных праблемах. Гэта ж выдавецтва падрыхтавала аднатомнік выбраных твораў Брэхта і асобнае выданне п'есы «Матуля Кураж і яе дзеці» з ілюстрацыямі вядомага польскага графіка Тадэвуша Кулісевіча.

З выпадку знамянальнай даты тэатр «Берлінер ансамбль» сумесна з Акадэміяй мастацтваў ГДР арганізоўвае шырокі міжнародны форум: розныя бакі творчасці Брэхта будуць абмяркоўваць з 9 па 16 лютага ў Берліне спецыялісты тэатральнага мастацтва з 40 краін, у тым ліку Савецкага Саюза і іншых сацыялістычных краін, Фінляндыі, Італіі, Францыі, Англіі, Бразіліі, ААР, Індыі. Удзельнікі форуму прагледзяць 15 пастановак Брэхта, з іх восем спектакляў, падрыхтаваных у тэатры «Берлінер ансамбль».

Прадстаўнікі розных краін свету з'язджаюцца ў гэтыя дні ў Берлін, каб адзначыць творчасць цудоўнага чалавека, які ўсё жыццё свае аддаў справе служэння міру, дэмакратыі і прагрэсу.

Е. БАШМАЧНІКАЎ. (ТАСС).

Т. К. КІН-КАМІНСКІ

7 лютага 1968 года заўчасна пайшоў з жыцця наш сябра, таварыш па сцэне, артыст вялікай сцэнічнай абаяльнасці Тадэвуш Карлавіч Кін-Камінскі.

Больш як 25 гадоў яго нядоўгага жыцця (нарадзіўся Т. Кін-Камінскі ў маі 1922 года) былі звязаны з Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатрам імя Янкі Купалы. Тут ён упершыню ў 1940 годзе ўбачыў святло рампы, выйшаўшы на сцэну ў якасці статыста, а пасля заканчэння студыі ў 1947 годзе стаў акцёрам-прафесіяналам.

Тэатр быў сапраўдным яго прызваннем. Для Кін-Камінскага не існавала маленькіх роляў, да кожнай, нават самай маленькай, ён ставіўся як сапраўдны мастак, дакладна шліфуючы кожны рух, кожнае слова.

На сцэне купалаўскага тэатра Кін-Камінскім сыграна больш як 50 роляў. Сярод іх Гамер («Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона), Парфірый Сыраварaў («У мяцелiцу» Л. Лявонава), Кяміль («Дзівак» Назыма Хікмета), Пухаў («Традыцыйны збор» В. Розава), пан Быкоўскі («Паўлінка» Я. Купалы). Апошнюю ролю артыст сыграў 135 разоў.

Смерць раптоўна вырвала з нашых радоў мастака, які ўвайшоў у пару сваёй творчай сталасці. Памяць аб ім, таленавітым артысце, сціплым чалавеку, добрым сябры заўсёды будзе жыць у нашых сэрцах.

ГРУПА ТАВАРЫШАЎ.

У АДНОЙ СПРЭЖЦЫ

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

шы сярод безаблічных «каробак» архітэктар Л. Патапаў досыць удала спраектаваў групу жылых дамоў, пастаўленых пад вуглом да шашы. На тарцах дамоў прадугледжваліся манументальна-дэкаратыўныя пано. Прапанаваныя архітэктарамі эскізы не адпавядалі сучасным патрабаванням. Тады разам з мастакамі былі знойдзены прымальныя рашэнні. Яны ажыццёўлены на трох дамах. Чацвёрты — у «рыштаваннях». Кампазіцыі на тарцах двух дамоў — «Спорт» і «Праца» — выкананы М. Навіцкім і Я. Пакаташкіным. Кампазіцыя на трэцім доме — «Шчаслівае дзяцінства» — выканана мастаком В. Ягоравым. Усе работы — у тэхніцы зграфіта. Яны добра скампанаваны. Лаканічныя, выразныя сілуэты пано яшчэ здалёку прыцягваюць увагу, не вырываюцца з архітэктурнага ансамбля.

ХАЧУ пагаварыць і пра месца станковага жывапісу ў сучасным інтэр'еры. Неяк так ужо здарылася, але станковую карціну, хоць яна валодае разнастайнейшымі магчымасцямі эстэтычнага ўздзеяння, амаль не сустрэнеш у сучасным грамадска-значным збудаванні. Яшчэ нядаўна, якіх-небудзь 10—15 гадоў назад, станковым жывапісам і скульптурай былі літаральна заселены ўсе грамадскія інтэр'еры. Фанфарныя «дэманстрацыі», «святы», бяздушныя копіі ў груваcткіх залачоных багетавых рамах былі неад'емнай часткай пампезнай архітэктурнай дэкарацыі. Напышлівая фабула такіх «твораў» дазваляла ім цудоўна ўпісвацца ў інтэр'еры будынкаў скажона зразуметага класіцызму. Станковую бутафорыю можна было аднолькава сустрэць і ва ўстанове, і ў бальніцы, і ў магазіне, і на вакзале... А сёння, як гэта ні парадаксальна, мастацтвы, закліканыя дапаўняць адно другое, не могуць ужыцца побач. Паспрабуйце змясціць у Палацы спорту станковую рэч — наўрад ці будзе яна там арганічнай.

Архітэктура ў сучасных інтэр'ерах аперыруе чыстымі формамі, выразнай тэктонікай, вялікімі плоскасцямі. Удзел станковай карціны тут неабходны, але, на жаль, часта вялікія творы, значныя па зместу, не могуць упісацца ў гэтую архітэктуру. Мастакі ствараюць звычайна творы «безадрасныя», разлічаныя на выстаўку або ў лепшым выпадку на музей. Варта было б разлічваць жывапісныя творы на масавага гледача, на экспазіцыю палатна ў памяшканнях грамадскага прызначэння. (Зразумела, унікальныя творы пав'нны мець «пастаянную прапіску» ў музеях). Трэба ствараць жывапісныя палотны, разлічаныя на інтэр'еры школ, інстытутаў, палацаў культуры.

Пакуль што ў нас вельмі мала станковых работ, якія маглі б «ўпісацца» ў самы сучасны інтэр'ер і скласці сінтэтычнае адзінства з вобразам архітэктурным. Але яны ёсць. Вось, напрыклад, карціна М. Данцыга «Мой Мінск». Мне здаецца, гэтае палатно магло б арганічна ўвайсці ў інтэр'ер, скажам, гарвыканкома або іншага грамадскага будынка. Выразная пабудова кампазіцыі, яснасць і чысціня пластычных сродкаў, некалькі экспрэсіўны колер — усе гэтыя якасці дазваляюць карціне (станковай!) выдатна ўжыцца з вялікімі плоскасцямі сучаснага інтэр'ера. Апошнія работы М. Савіцкага, прысвечаныя тэме Вялікай Айчыннай, хвалюючыя гуманістычным зместам, гэтак жа былі б арганічныя ў вялікім мемарыяльным комплексе (якога пакуль што не існуе), прысвечаным барацьбе нашага народа супраць фашызму. Сучасная архітэктура здольная падкрэсліць вартасці некаторых палотен Л. Шчэмелева, А. Кішчанкі, І. Басава. Нерасплыўчатасць вобраза, гнуткі выяўленчы лад работ гэтых мастакоў адпавядае сённяшнім імкненням дойлідаў.

Сучасны інтэр'ер часта патрабуе яркіх дэкаратыўных акцэнтаў, і было б няправільна зводзіць ролю станковага палатна толькі да сэнсавага ўздзеяння. У кабінеце доктара або ў цэху завода нельга змясціць карціну з глыбокім падтэкстам. У гэтых выпадках куды больш дарэчы незамыславатая дэкаратыўная кампазіцыя з акцэнтам на каларыце або арнаментыцы. Вызначаць жа, дзе і якому твору быць, павінен савет архітэктараў і мастакоў.

Кожны від мастацтва мае сваю спецыфіку, свае законы існавання, свае задачы і магчымасці. Наспеў час, ведучы размову аб манументальна-дэкаратыўным і станковым жывапісе, звязаным з сучасным інтэр'ерам, перастаць патрабаваць ад кожнай дэкаратыўнай плямы сэнсавай нагрузкі. Важна, каб з'яўляліся станковыя палотны, прыгожыя і здольныя ўздзейнічаць на чалавека, прадугледжаныя ў тым або іншым інтэр'еры з самага пачатку праектавання.

У АПОШНІЯ гады шмат у чым змянілася паняцце функцыянальнасці і мастацкай сутнасці інтэр'ера. Адпаведнасць архітэктурнага вобраза інтэр'ера яго прызначэнню, разумнае прымяненне матэрыялаў, абсталявання, асвятлення, прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і да т. п. — усё гэта трэба ўлічваць пры арганізацыі ўнутранай прасторы грамадскіх будынкаў. Тэхнічная эстэтыка намнога пашырыла паняцце інтэр'ера як комплексу функцыянальных, тэхнічных, эстэтычных і нават псіхалагічных патрабаванняў. Пералік гэты паказвае, які вялікі калектыў спецыялістаў павінен удзельнічаць у арганізацыі інтэр'ера **з самага пачатку праектавання**. Вядучым тут павінна быць супрацоўніцтва архітэктара і мастака. Але пакуль у нас мала мастакоў — спецыялістаў па інтэр'еру (іх амаль няма), паўнапраўным арганізатарам інтэр'ера з'яўляецца архітэктар. Таму і няўдачы, якія выяўляюцца пазней, — на яго сумленні. Практыка ж прыцягнення мастакоў з Мастацкага фонду, ды яшчэ ў канцы будаўніцтва, мала апраўдвае сябе, паколькі мастак прыходзіць як афарміцель ужо арганізаванай прасторы. Гэта пярэчыць прынцыпам сінтэзу мастацтваў. Знешняе афармленне ў абсалютнай большасці выпадкаў не здольнае данесці ідэй, калі яны не закладзены ўжо ў архітэктурным вобразе. Калі ж мастак актыўна працуе з пачатку праектавання над архітэктурна-мастацкай арганізацыяй інтэр'ера, ён здольны апладніць многія рашэнні архітэктара цікавымі ідэямі.

Прывядзем прыклад. У многіх будынках устаноў, інстытутаў, вакзалаў падчас вельмі цяжка арыентавацца. Арганізацыя арыентыроўкі звычайна даручаецца загадчыку гаспадарчай часткай або каменданту будынка. І вось вісіць у вестыбюлі якога-небудзь міністэрства непрыкметная рамачка, дзе абавязкова на карычневым або «васільковым» фоне падпісаны нумары кабінетаў і іх размяшчэнне. Элементы такой «інфармацыі» непрыкметныя воку. Мастак жа мог бы скарыстаць наглядную інфармацыю ў якасці аднаго з элементаў агульнага архітэктурна-мастацкага рашэння інтэр'ера. Звязаны з усім памерам памяшкання, шрыфт інфармацыі мог бы скласці пэўную рытмічную сістэму, якая выклікала б станоўчыя зрокавыя эмоцыі яшчэ да прачытання наведвальнікам таго або іншага надпісу.

Цяпер актыўна развіваецца і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, у тым ліку скульптура «малых форм». Але дзе ж вынікі гэтага развіцця ў нашых грамадскіх інтэр'ерах? Вось, напрыклад, дэкаратыўныя вазы ў фае кінатэатра «Партызан». Іх нямнога, і яны не замінаюць. Дырэкцыя кінатэатра набыла гэтыя «дзяжурныя» сасуды ў мастацкім салоне. Калі б архітэктар, праектуючы інтэр'ер буйнага грамадскага будынка, запрашаў скульптара або мастака, дык той у адпаведнасці з задумай дойліда мог бы ствараць дэкаратыўныя формы, якія адпавядалі б дадзенаму ансамблю. Тады яны былі б глыбока арыгінальныя, індывідуальныя, не сустракаліся б у іншых месцах. Архітэктары ж часта грэбуюць «малымі формамі»—ад стэнда для аб'яў і газетнай вітрыны да дзвярной ручкі. Кожны з гэтых элементаў павінен быць эстэтычна выразным, удзельнічаць у складаным адзінстве ансамбля інтэр'ера. Эстэтычнае адзінства інтэр'ера можа быць дасягнута тады, калі ўсе кампаненты з самага пачатку будуць уваходзіць у архітэктурна-мастацкую задуму (канечне, нельга прапанаваць задумваць урну або вешалку адначасова з праектаваннем будынка, але ствараць прадметы абсталявання трэба у цесным кантакце з архітэктарам).

МОЖА трэба стварыць цэнтр, які каардынаваў бы сумесную работу мастакоў і архітэктараў? Аб'яднаўшы іх намаганні, мы маглі б працаваць куды больш паспяхова, чым да гэтага часу. У апошнія гады Саюз мастакоў БССР многае зрабіў для гэтага. Яшчэ больш прадстаіць зрабіць.

г. Гомель.

ПЯЦЬ ГАДОЎ НА СЛУЖБЕ ПОЛЬСКАГА СЯЛА

«У Язёранах» — так называецца папулярная сярод працаўнікоў палёў народнай Польшчы штотыднёвая перадача Варшаўскага радыёвяшчання. Калі пагледзець на карту Польскай Народнай Рэспублікі, дык можна знайсці некалькі дзесяткаў населеных пунктаў з назвай Язёраны. Але ні адно з іх не мае нічога агульнага з сялом, аб якім расказваецца ў радыёперадачах. І хоць сяло выдуманае, усё, што адбываецца ў Язёранах, цікавіць, хвалюе, займае мільёны польскіх сялян. Чаму, запытаеце вы. Ды таму, што кожнае пытанне, якое датычыцца сельскай гаспадаркі і якое закранаецца ў радыёперадачы «У Язёранах», старанна вывучаецца ў сёлах рэспублікі. Анцёры — удзельнікі радыёперадачы, як сапраўдныя журналісты, выязджаюць на месцы і там складаюць праграму, якая блізкая сотням тысяч працаўнікоў палёў.

12 студзеня радыёперадачы «стукнула» роўна пяць гадоў. Гэта 500 перадач, або 500 гадзін вяшчання. Такі вынік работы 40 артыстаў, якія выступаюць у галоўных ролях, і больш за 200 чалавек, якія ўдзельнічаюць у эпізодах. Гэта аднасова шматгадовая праца пісьменніцкага актыву — Соф'і Посмыш-Пясецкай, Анджэя Муляpчыка і Уладзіслава Мільчарэка, якія атрымліваюць да тысячы пісьмаў у месяц.

Уплыў радыёперадачы «У Язёранах» на польскае сяло велізарны. Аб гэтым сведчаць «клубы сяброў Язёран», адкрытыя ў сотнях сёл народнай Польшчы. Кожная перадача садзейнічае развіццю культуры і асветы ў сельскай мясцовасці, прыносіць канкрэтны вынік: па ініцыятыве сялян будуюцца водаправоды, школы, вучацца кадры механізатараў сельскай гаспадаркі, робіцца ўсё, каб, як кажуць палякі, «вёска жыла і развівалася, а не гібела».

В. КУЗНЯЦОЎ,
карэспандэнт ТАСС.

Варшава.

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

23 ЛЮТАГА САВЕЦКІ НАРОД АДЗНАЧАЕ ПАЎВЕКАВЫ ЮБІЛЕЙ САВЕЦКАЯ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ.

Загартаваная і магутная родная армія пільна ахоўвае мір і шчасце Савецкай краіны.

НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПАВІНШАВАЦЬ СВАІХ РОДНЫХ І СЯБРОЎ З ГЭТЫМ СВЯТАМ

ПРАДПРЫЕМСТВЫ СУВЯЗІ З 13 ПА 17 ЛЮТАГА ПРЫМАЮЦЬ ВІНШАВАЛЬНЫЯ ТЭЛЕГРАМЫ ПА ІЛЬГОТНАМУ ТАРЫФУ — У ДВА РАЗЫ ТАННЕЙ, ЧЫМ ЗВЫЧАЙНЫ.

Да 17 лютага праводзіцца прыём віншавальных тэлеграм з тэрмінам уручэння, устаноўленым адпраўнікам тэлеграмы.

Не адкладвайце адпраўку віншаванняў на апошнія перадсвяточныя дні: прадпрыемствы сувязі, з прычыны вялікай перагрузкі, гарантаваць своечасовую дастаўку тэлеграм, пададзеных пасля 17 лютага, не могуць.

АДПРАЎЛЯЙЦЕ ВІНШАВАЛЬНЫЯ ТЭЛЕГРАМЫ, ПІСЬМЫ І ПАШТОЎКІ ЗАГАДЗЯ.

МІНІСТЭРСТВА СУВЯЗІ БССР.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

9 лютага

Першая праграма. 10-45 — «На зімовых Алімпійскіх гульнях» (лыжы, канькі). Перадача з Грэнобля. 16-50—навіны. Праграма перадач. 17-05—для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. Англійская мова. Урок 17-ы. 17-30—«Сельскі веснік». 17-50—«Тэлевізійны футбольны матч». Перадача 3-я. «Дынама» (Мінск). 18-30—«На зімовых Алімпійскіх гульнях». (Хакей СССР—ЗША). Перадача з Грэнобля. У перапынку—дзённік «На Белай алімпіядзе» (М). 21-00 — «Навіны дня». 21-10—«На музычнай хвалі». 21-15—«Эстафета навін» (М). 22-00—«Па вашых просьбах». Канцэрт. 22-30—«Акцёры і ролі». Заслужаны артыст БССР Раман Філіпаў. 23-30—«На сон надыходзячы». Музычная праграма.

10 лютага

Першая праграма. 8-55 — праграма перадач. 9-00 — «Гімнастыка для ўсіх» (М). Экран — завочнікам. 9-30—для студэнтаў ВНУ. «Вышэйшая матэматыка». II курс. 10-15—«На зімовых Алімпійскіх гульнях». (Лыжы, канькі). Перадача з Грэнобля. 12-30—для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. Англійская мова. Урок 17-ы (паўтор). 13-00 — «Музычная шкатулка». 13-20—«Мастацтва кінадакумента». Да вынікаў пленума Саюза кінематаграфістаў БССР. 14-00 — праграма каляровага тэлебачання (М). 15-30 — тэлевізійны тэатр для дзяцей. Д. Бродская. «Марыйчына дзяцінства». Тэлевізійны спектакль (М). 16-30—да 50-годдзя органаў народнага кантролю. «На варце інтарэсаў грамадства». 17-00—«Песня ў салдацкім шынялі». Перадача з Усесаюзнага Дома кампазітараў (М). 18-00—«Летапіс паўвеку». Тэлевізійны шматсерыйны дакументальны фільм. «Год 1966-ы» (М). 19-00 — «КВЗ-68» (М). 20-30 — інфармацыйная праграма «Час» (М). 21-00—«На зімовых Алімпійскіх гульнях». (Фігурнае катанне, жанчыны). Перадача з Грэнобля. У перапынку— дзённік «На Белай алімпіядзе» (М).

Другая праграма. 9-45 — «З днём нараджэння!». Музычная вясёлая праграма (М). 10-15 —для дзяцей. «Залаты ключык». Мастацкі фільм. 18-00 — дзіцячы экран. «Як крот сабе штонікі раздабыў». «Песенька мышаняці». Мультыплікацыйныя фільмы 19-30 — музычны спектакль.

11 лютага

Першая праграма. Экран — завочнікам. 8-30 — для студэнтаў ВНУ. «Тэхналогія металаў». 9-00 — «На зарадку — станавіся!» (М). 9-15 — для школьнікаў. «Будзільнік» (М). 9-45—для дзяцей. «Пра кніжку новую...». Байкі У. Корбана і Э. Валасевіча. 10-15—«Белыя і чорныя». Тэлевізійны шахматна-шашачны клуб. Аматарам шахмат. 10-45 — «На зімовых Алімпійскіх гульнях». (Лыжы, канькі). Перадача з Грэнобля. 13-15—«Навіны дня». Кіначасопіс (М). 13-30—«Сястра Ільіча». Да 90-годдзя М. І. Ульянавай. Перадача з Ульянаўска. 14-00—праграма каляровага тэлебачання (М). 15-00—«На зімовых Алімпійскіх гульнях». (Скачкі з трампліна). Перадача з Грэнобля. 17-00—«Сельскі клуб» (М). 18-00—«Музычны кіёск» (М). 18-30—«На зімовых Алімпійскіх гульнях» (Хакей. ЗША—Канада). Перадача з Грэнобля. 20-45—«Сем дзён». Міжнародная праграма (М). 21-15 — па вашых просьбах. «Гадзіннік спыніўся апоўначы». Мастацкі фільм. 23-00—«На зімовых Алімпійскіх гульнях». (Хакей. СССР—ФРГ). Перадача з Грэнобля. У перапынках — тэлевізійныя навіны і дзённік «На Белай алімпіядзе» (М).

Другая праграма. 11-00 — да 50-годдзя Савецкіх Узброеных Сіл. «Пяю табе, салдат». Канцэрт. 11-50 — для дзяцей. «Міколка-паравоз». Мастацкі фільм. 19-00—па роднай краіне. «Ленінград». «Рыга». «Гэта — Сочы». Кінанарысы. 19-30—«За вітрынай універмага». Мастацкі фільм. 20-55—«Цымбалы спяваюць пра Расію». Музычны фільм. 21-15—літаратурны тэатр. Б. Брэхт. Да 70-годдзя з дня нараджэння (М). 22-15—у эфіры — «Маладосць». «Гарызонт». Перадача з Ленінграда.

Міністэрства культуры БССР з глыбокім жалем паведамляе аб заўчаснай смерці артыста Беларускага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Тадэвуша Карлавіча Кін-Камінскага і выказвае спачуванне родным нябожчыка.

Беларускае тэатральнае аб'яднанне з глыбокім жалем паведамляе аб смерці члена таварыства, артыста Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Кін-Камінскага Тадэвуша Карлавіча і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Калектыў Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы з глыбокім жалем паведамляе аб заўчаснай смерці артыста тэатра Кін-Камінскага Тадэвуша Карлавіча і выказвае спачуванне сям'і і блізкім нябожчыка.

Куток калекцыянера

НАВЕЧНА ЗАЛІЧАНЫ Ў СПІСЫ ЧАСЦІ

Міністэрства сувязі СССР выпусціла ў абарот тры новыя маркі з серыі «Навечна залічаны ў спісы часці».

На першай — камандзір узвода 50 асобнага матарызаванага інжынернага батальёна малодшы лейтэнант Сяргей Байкоў. Злева ад яго гарэльефнага адлюстравання паказаны баявы эпізод, які абясcмерціў імя героя. Было гэта ў першы месяц вайны ў раёне Пскова. Каб затрымаць імклівы націск варожых войск, малодшы лейтэнант Байкоў прыняў рашэнне ўзарваць чыгуначны мост праз раку Вялікая. Выконваючы гэтую аперацыю, ён загінуў смерцю храбрых. Малодшаму лейтэнанту Байкову было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яго імя навечна занесена ў спісы адной з вайсковых часцей.

Марка выканана ў спалучэнні блакітнага колеру з шэрым.

Дзве астатнія маркі гэтай серыі прысвячаюцца воінам Савецкай Арміі Аляксандру Пакальчуку і Пятру Гутчанку, якія ў жніўні 1942 года ў баі пад Клецкай закрылі сваімі целамі амбразуру варожага дзота.

На ружова-шэрай марцы ўзноўлены гарэльеф галавы Аляксандра Пакальчука, на шэра-зялёнай — Пятра Гутчанкі. Злева адлюстраваны подзвігі герояў.

Аўтар серыі Пётр Бендэль. Друк глыбокі. Цана марак па 4 капейкі. Зубцоўка грабеньчатая. Нумары па каталогу 3625 — 3627. Памеры 30 на 42 міліметры.

Марыя КАВАЛЕВА. (АДН).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН [намеснік галоўнага рэдактара], А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44.04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22.04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856 Друкарня выдавецтва «Звязда» АТ 01564